МАЙ
23
ЧАЦВЕР
1940 год
№ 15 (471).
ЦАНА 20 КАП.

*Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН
ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА
СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ
БССР
І УПРАЎЛЕННЯ ПА
СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ
ПРЫ СНК БССР

## ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

20 мая 1940 года адбыўся пленум новавыбранага ЦК КП(б) Беларусі. Пленум выбраў Бюро ЦК КП(б) Беларусі ў наступным складзе:

**ЧЛЕНЫ БЮРО ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ:**

**Т. т. Панамарэнка П. К., Кулагін М. В., Грэкава Н. Г., Малін В. Н., Кісялёў К. В., Наталевіч Н. Я., Цанава Л. Ф., Матвэеў А. П., Кузняцоў Ф. І.**

**КАНДЫДАТЫ У ЧЛЕНЫ БЮРО ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ**

**Т. т. Байкачоў Г. М., Галоўнін В. Я., Крупеня І. А., Зійдзінаў Г. Б.**

Пленум выбраў першым сакратаром Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі тав. **Панамарэнка П. К.**, другім сакратаром тав. **Кулагіна М. В.**, трэцім сакратаром тав. **Грэкаву Н. Г.**, сакратаром ЦК КП(б) Беларусі па кадрах тав. **Байкачова Г. М.**, сакратаром ЦК КП(б) Беларусі па прапагандзе тав. **Маліна В. Н.**

Пленум ЦК КП(б) Беларусі зацвердзіў: загадчыкам Аддзелам кадраў ЦК КП(б)Б сакратара ЦК КП(б)Б па кадрах тав. **Байкачова Г. М.**, загадчыкам Аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б сакратара ЦК КП(б)Б па прапагандзе тав. **Маліна В. Н.**, загадчыкам Аргінструктарскім аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **Зійдзінава Г. Б.**, загадчыкам Сельскагаспадарчым аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **Гласава С. М.**, загадчыкам Ваенным аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **Прохарава Н. І.**

Рэдактарам газеты «Звязда» пленум зацвердзіў тав. **Гарбунова Т. С.**, рэдактарам газеты «Акцябр» — тав. **Зэнгроса Е. І.**

***

20 мая 1940 года адбылося першае пасяджэнне Цэнтральнай рэвізійнай камісіі. Старшынёю Цэнтральнай рэвізійнай камісіі выбран тав. **Седых В. Я.**

## Шлях росту і росквіту

20 мая закончыў сваю работу XVIII з'езд Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі. З'езд падагуліў гістарычныя перамогі, дасягнутыя беларускім народам пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, і намеціў захапляючыя перспектывы далейшага няўхільнага росту Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Да XVIII з'езда КП(б)Б беларускі народ прышоў з'едзіным у адну сям'ю. «Ажыццёўлена векавая мара вялікага беларускага народа аб з'еднанні. Навекі пакладзен канец штучнаму расшчапленню беларускага народа». **(З даклада сакратара ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнкі).**

Непазнавальна вырасла наша краіна. Навекі адышла ў нябыт галодная саламяная вёска, аплаканая горкімі слязамі нашых вялікіх песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У сваім справаздачным дакладзе аб рабоце ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка сказаў: «У рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і поўнай перамогі генеральнай лініі нашай партыі, у рэзультаце ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі Беларусь ператварылася з адсталай дробнасялянскай краіны, ускраіны царскай Расіі ў мінулым, у передавую індустрыяльна-калгасную совецкую соцыялістычную рэспубліку».

Усімі дасягненнямі беларускі народ абавязан вялікай партыі большэвікоў, абавязан роднаму Сталіну, які з дня ў дзень па-бацькоўску клапоціцца аб шчасці і дабрабыце беларускага народа.

«Рост вытворчасці як у галіне прамысловасці, так і ў галіне соцыялістычнай сельскай гаспадаркі абумовіў новы ўздым матэрыяльнага і культурнага становішча працоўных Беларусі». Адным з самых яркіх паказальнікаў гэтага ўздыму з'яўляецца развіццё і рост беларускай культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Справаздачны перыяд азнаменаваўся магутным уздымам новай соцыялістычнай культуры беларускага народа. У сваім справаздачным дакладзе тав. Панамарэнка падрабязна спыніўся на пытанні аб адносінах да кадраў, будуючых гэту новую культуру, аб адносінах да інтэлігенцыі.

«Партыйныя арганізацыі многа зрабілі для таго, каб ліквідзіраваць да канца меўшыя месца ў Беларусі няправільныя, варожыя совецкай інтэлігенцыі погляды, несумяшчальныя з палітыкай партыі. Носьбіты гэтых поглядаў практыкавалі пагардлівыя, зняважлівыя адносіны да совецкай інтэлігенцыі, разглядаючы яе, як сілу чужую і нават варожую рабочаму класу і сялянству. Гэтыя людзі, гаварыў таварыш Сталін, прадаўжаюць дудзіць у старую дуду, няправільна пераносячы на совецкую інтэлігенцыю тыя погляды і адносіны, якія мелі сваю падставу ў стары час, калі інтэлігенцыя знаходзілася на службе ў памешчыкаў і капіталістаў».

Выкарчаваўшы рэшткі антыбольшэвіцкіх «махаеўскіх» адносін да совецкай інтэлігенцыі, партыя забяспечыла новы ўздым творчай актыўнасці работнікаў культуры і мастацтва. Гэтаму ўздыму ў велізарнай меры спрыяў і разгром ворагаў народа — трацкістаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў, якія імкнуліся ўцвердзіць наша мастацтва і літаратуру на чуждых нацыяналістычных пазіцыях. Стараннямі гэтых агідных ворагаў была створана легенда аб мнімай пасіўнасці і бязволлі народа, які без наракання пераносіў уціск і зневажанні.

«Беларускі народ — мужны, здольны разграміць любога ворага, народ-герой, народ-змагар, які пранёс праз стагоддзі сваю культуру, сваю мову, сваю волю да перамогі, сваю нянавісць да ворагаў, народ, адданы партыі і совецкай уладзе, граміўшы розных прыгнятальнікаў на працягу ўсёй гісторыі, — разграміў і гэтых здраднікаў, выкарчаваў і змёў іх з твару зямлі».

У святле гэтых слоў, сказаных тав. Панамарэнкам, нам трэба па-новаму падыйсці да пытання аб якасці мастацкага ўвасаблення народа ў творах беларускага мастацтва. Занава пераглядзім нашы кнігі, спектаклі, кінофільмы, каб пераканацца: з дастатковай паўнатой адлюстраваны ў іх інтэлектуальная магутнасць народа, яго волевыя, мужныя, свабодалюбівыя якасці; ці няма ў іх часамі прыпіжанага, эмпірычнага паказу беларускага народа.

«Апошнія два годы былі перыядам сапраўды бурнага росквіту мастацтва Совецкай Беларусі. Яшчэ два годы таму назад Беларусь не мела ніводнай нацыянальнай оперы і балета. Зараз яна мае такія выдатныя оперы, як «Міхась Падгорны» кампазітара Цікоцкага, «Кветка шчасця» кампазітара Туранкова, «У пушчах Палесся» кампазітара Багатырова, балет «Салавей» кампазітара Крошнера». Самы факт таго, што нашы беларускія кампазітары авалодваюць самым складаным і адказным жанрам музычнага мастацтва—жанрам оперы, з'яўляецца лепшым пацвярджэннем агульнага росту музычнага мастацтва Совецкай Беларусі.

Поспехі нашага музычнага мастацтва выразіліся і ў росце калектыва Беларускага опернага тэатра, «у якім ёсць ужо нямала актораў значнага вакальнага і драматычнага даравання».

«Сур'ёзных поспехаў дабіліся нашы драматургі і калектывы драматычных тэатраў. Нашы тэатры ўзбагаціліся новымі творамі, ілюстрыруючымі велізарны рост майстэрства і спеласці нашых драматургаў. Да гэтых твораў па праву павінны быць аднесены такія п'есы, як «Хто смяецца апошнім» Крапівы, «Над Бярозай-ракой» Глебкі, «Пагібель воўка» Эдуарда Самуйлёнка і г. д.».

«Прыемна, што нашы драматычныя тэатры, у першую чаргу такія тэатры, як БДТ—1 і Віцебскі драматычны тэатр, на ўзроўні вялікай мастацкай культуры справіліся з пастаноўкай п'ес нашых совецкіх аўтараў, аўтараў братніх рэспублік і вялікіх драматычных твораў рускіх і заходніх класікаў».

Тав. Панамарэнка ў сваім дакладзе асабліва адзначыў пастаноўку Віцебскім тэатрам п'есы Пагодзіна «Чалавек з ружжом», у якой заслужаны артыст рэспублікі Малчанаў стварыў вобраз вялікага Леніна. Факт пастаноўкі п'есы «Чалавек з ружжом», у якой фігурыруе Ленін, з'яўляецца сведчаннем узмужнеласці нашага тэатральнага мастацтва. Толькі спелае і выдатнае мастацтва здольна паказаць перад намі вобраз вялікага чалавека.

«Нямалых поспехаў дабіліся за гэты час Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР, Тэатр юнага гледача. Значна выраслі калгасна-соўгасныя тэатры. Некаторыя з іх настолькі выраслі, што аказалася магчымым ператварыць іх у абласныя тэатры. Створан драматычны тэатр у Гомелі. Рэарганізаван Дзяржаўны рускі драматычны тэатр у гор. Магілеве. Абодва яны значна папоўніліся маладымі творчымі работнікамі».

Тав. Панамарэнка ў сваім дакладзе асобна адзначыў поспехі беларускага выяўленчага мастацтва, якое накапіла дастаткова сіл і вопыту для таго, каб прыступіць да ажыццяўлення задачы велізарнай важнасці і значэння: стварыць тэматычную выстаўку «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

«У справаздачны перыяд закладзены сур'ёзныя асновы для далейшага развіцця беларускай нацыянальнай кінематаграфіі».

Вялікіх поспехаў дабіліся беларускія пісьменнікі і паэты. Імі напісан цэлы рад твораў, «падымаючых усю беларускую літаратуру на больш высокую ступень, паказваючых яе несумненны ідэйна-мастацкі рост». Да гэтых твораў перш за ўсё адносяцца п'есы Крапівы, Глебкі, Чорнага, Клімковіча, Вольскага, Самуйлёнка, раман Эд. Самуйлёнка «Будучыня», новая аповесць Зм. Бядулі, новыя апавяданні Міхася Лынькова, раман «Паўстанне» М. Пасляднёвіча, новы раман Р. Мурашкі, «Юнацкі свет» А. Куляшова, новыя вершы Пятруся Броўкі, выдатныя вершы Максіма Танка, Ф. Пестрака. «Літаратурна-мастацкая дзейнасць нашых паэтаў і пісьменнікаў атрымала высокую ацэнку Саюзнага ўрада. Тт. Янка Купала, Я. Колас, З. Бядуля, П. Броўка, П. Глебка, М. Лынькоў і Э. Самуйлёнак былі ўзнагароджаны орданамі Совецкага Саюза».

Побач з нашым прафесіянальным мастацтвам расло і самадзейнае мастацтва, лепшыя прадстаўнікі якога выраслі да высокага майстэрства і культуры выканання.

«З 5 па 15 чэрвеня ў Маскве адбудзецца дэкада беларускага мастацтва. На дэкадзе будуць прадстаўлены Дзяржаўны оперны тэатр Беларусі, Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр. У заключным канцэрце на дэкадзе прымуць удзел калектывы Дзяржаўнай філармоніі, калектывы тэатраў і мастацкай самадзейнасці рэспублікі. Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве — самая вялікая, значная і яркая падзея культурнага жыцця нашага народа. Яна, дэкада, з аднаго боку падагульвае бурны рост і росквіт літаратуры, мастацтва і народнай творчасці, з другога боку, з'явіцца магутным стымулам далейшай работы».

XVIII з'езд КП(б)Б падвёў багатыя вынікі развіцця беларускага соцыялістычнага мастацтва і намеціў бліскучыя перспектывы яго далейшага росту. Над ажыццяўленнем задач, пастаўленых перад нашым мастацтвам XVIII з'ездам КП(б)Б, будуць нястомна працаваць усе работнікі мастацтва БССР.

## Справаздачны даклад аб рабоце ЦК КП(б)Б на XVIII з'ездзе комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі

### Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. П. К. ПАНАМАРЭНКА*)

Уступную частку свайго даклада тав. Панамарэнка прысвяціў агляду буйнейшых гістарычных падзей, якімі запоўнен двухгадовы перыяд з часу XVII з'езда компартыі Беларусі.

— Для ўсяго Совецкага Саюза, — гаворыць тав. Панамарэнка, — гэты перыяд быў перыядам далейшага росту і працвітання, эканамічнага і культурнага ўздыму, перыядам далейшага ўмацавання ваеннай магутнасці і павышэння міжнароднага аўтарытэту Совецкага Саюза. Таварыш Сталін з трыбуны гістарычнага XVIII з'езда падвёў найвялікшыя вынікі барацьбы нашай партыі і шматмільённага совецкага народа за выкананне пласа другой пяцігодкі, за пабудову соцыялістычнага грамадства. У сваім дакладзе таварыш Сталін акрэсліў велічную праграму наступовага пераходу нашай краіны ад соцыялізма к комунізму. Рашэнні XVIII з'езда ВКП(б) і даклад таварыша Сталіна з'явіліся сцягам нашай работы за справаздачны перыяд.

Тав. Панамарэнка гаворыць аб поспехах Совецкага Саюза ў галіне знешняй палітыкі, дасягнутых за справаздачны перыяд. Выкрыты катарныя падкопы англа-французскіх паджыгальчыкаў вайны, спрабаваўшых уцягнуць СССР у крывавую бойню. Паміж Совецкім Саюзам і Германіяй устанавіліся трывалыя, дзелавыя, прыязныя адносіны. За гэты-ж перыяд разляцелася ўшчэнт штучна створаная лаcкутная буржуазна-памешчыцкая польская дзяржава. Совецкі народ вызваліў сваіх адзінакроўных братоў — беларусаў і украінцаў з-пад панскага іга. Зараз 13 мільёнаў беларусаў і украінцаў, якія ў недалёкім мінулым знаходзіліся пад ігам польскіх паноў, увайшлі ў дружную сям'ю народаў Совецкага Саюза і карыстаюцца ўсімі здабыткамі перамогшага соцыялізма ў нашай краіне. Навекі пакладзен канец штучнаму расшчапленню беларускага народа.

У рэзультаце мудрай палітыкі совецкага ўрада, БССР павялічылася па сваёй тэрыторыі і насельніцтву амаль у два разы, ператварылася ў рэспубліку з 10-мільённым насельніцтвам, чаго не маюць многія еўрапейскія дзяржавы.

— Гэтымі сусветна-гістарычнымі перамогамі,—гаворыць тав. Панамарэнка, — мы абавязаны творцу беларускай дзяржаўнасці, найвялікшаму другу беларускага народа, правадыру і настаўніку — таварышу Сталіну.

Тав. Панамарэнка перайшоў да разгляду работы, праробленай Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б і партарганізацыямі Беларусі за справаздачны перыяд.

— У рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, — сказаў тав. Панамарэнка,—і поўнай перамогі генеральнай лініі нашай партыі, у рэзультаце ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі Беларусь ператварылася з адсталай дробнасялянскай краіны, ускраіны царскай Расіі ў мінулым, у перадавую індустрыяльна-калгасную совецкую соцыялістычную рэспубліку.

— 80 працэнтаў ўсёй прадукцыі народнай гаспадаркі БССР, — гаворыць дакладчык, — прыпадае на долю прамысловасці. У БССР выпрацоўваюць 33,8 проц. усёй выпрацоўваемай у Саюзе фанеры, 27 проц. запалак, 30 проц. штучнай аліфы, 25 проц. дрожджаў, 11 проц. маргарыну, 10 проц. торфу. Па вытворчасці шарсцяных тканін БССР зараз займае другое месца ў Саюзе. У Беларусі занава створаны такія галіны прамысловасці, як торфадабываючая, лесапрацоўчая, хімічная, будаўнічых матэрыялаў, шкляная, металаапрацоўчая, дрэваапрацоўчая, запалкавая, тэкстыльная, швейная, гарбарна-футравая і абутковая, харчасмакавая, у тым ліку мясная, масларобча-малочная і кандзіцерская. Створаны такія галіны прамысловасці, якіх не ведала дарэволюцыйная Беларусь, як, напрыклад, вытворчасць штучнага шоўку, сельскагаспадарчае машынабудаўніцтва, станкабудаўніцтва, вытворчасць матораў, турбін і г. д. Зараз у Беларусі ствараецца радыёпрамысловасць.

Амаль уся прадукцыя, выпушчаная ў 1939 годзе, зроблена на новапабудаваных ці поўнасцю рэканструіраваных за годы совецкай улады прадпрыемствах. За годы двух сталінскіх пяцігодак пабудавана і асвоена звыш 1700 новых прадпрыемстваў. За годы двух сталінскіх пяцігодак у прамысловасць БССР укладзена больш аднаго мільярда рублёў. Свой дзяржаўны план прамысловасць рэспублікі ў 1939 годзе выканала па прамысловых наркаматах на 101,2 проц. За апошнія два годы прадукцыя ўсёй прамысловасці вырасла на 19,1 проц. і дасягнула аб'ёму ў 2.294,6 мільёна рублёў. Цэлы рад наркаматаў, галін прамысловасці і многія прадпрыемствы датэрмінова выканалі гадавую вытворчую праграму 1939 года, даўшы дадаткова на мільёны рублёў прадукцыі звыш плана.

Значна вырасла прадукцыйнасць працы. Выпрацоўка на аднаго рабочага ў 1939 годзе складае 11.178 рублёў супроць 9.296 рублёў у 1937 годзе. У 1939 годзе прадукцыйнасць працы ў параўнанні з 1937 годам вырасла на 25,3 проц. Адпаведна вырасла заработная плата.

Аналізіруючы работу прамысловасці за справаздачны перыяд, тав. Панамарэнка асаблівую ўвагу ўдзяляе рабоце мясцовай прамысловасці, якая мае ў Беларусі неабмежаваныя магчымасці для свайго росквіту.

Тав. Панамарэнка рэзка раскрытыкаваў і справядліва высмеяў некаторых мясцовых работнікаў, якія, марачы аб будаўніцтве прадпрыемстваў-гігантаў, аб вялікіх капіталаўкладаннях, выпускаюць зусім з-пад увагі невялікія прадпрыемствы, якія лёгка можна арганізаваць у кожным раёне для абслугоўвання штодзённых патрэб працоўных.

Расказаўшы дэлегатам з'езда аб рабоце ўсіх астатніх галін прамысловасці за справаздачны перыяд, тав. Панамарэнка перайшоў да аналізу работы партыйнай арганізацыі Беларусі ў галіне соцыялістычнага земляробства.

Сельская гаспадарка Беларускай ССР



узброена магутным паркам трактараў і складаных сельскагаспадарчых машын. На тэрыторыі Беларусі працуюць 9.648 калгасаў, яны аб'ядноўваюць 750 тысяч сялянскіх гаспадарак. У распараджэнні калгасаў знаходзіцца 97,6 проц. усёй ворнай зямлі. Астатняя ворная зямля знаходзіцца ў аднаасобнікаў, якія складаюць 8 проц. усіх гаспадарак. Справаздачны перыяд быў перыядам далейшага ўздыму соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, росту калгаснай вытворчасці, росту палітычнай і вытворчай актыўнасці калгасных мас.

Дакладчык расказаў, як большэвікі Беларусі выконваюць рашэнні майскага Пленума ЦК ВКП(б) (1939 г.). У Беларусі было вельмі многа скажэнняў статута сельскагаспадарчай арцелі. Упартай і крапатлівай работай большэвікі Беларусі разам з калгаснікамі навялі парадак у калгасным землекарыстанні. У рэзультаце выпраўленняў было прырэзана да грамадскіх земляў калгасаў 109.683 гектары. Наладзілі ўлік землекарыстання калгасаў і правялі адмежаванне прысядзібных участкаў ад грамадскіх земляў калгасаў. Ліквідзіраваны парушэнні статута сельскагаспадарчай арцелі па нормах жывёлы ў асабістым карыстанні калгаснікаў. Тав. Панамарэнка заклікаў дэлегатаў з'езда неаслабна, штодзённа правяраць на месцах выкананне рашэнняў майскага Пленума ЦК ВКП(б).

Пры ўсямерным падтрыманні і асабістай зацікаўленасці калгаснага сялянства большэвікі Беларусі ўзначалілі работу па ссяленню хутароў у добра ўпарадкаваныя калгасныя вёскі. Гэта з'явілася буйным крокам у большэвіцкім умацаванні калгасаў Беларусі. У рэспубліцы ў 1938 годзе налічвалася 177 тысяч хутароў. За другую палову 1938 года, пасля XVII з'езда компартыі Беларусі, было ссялена звыш 20 тысяч хутароў. У той час гэта лічылася вялікім дасягненнем, але гэта было яўна недастаткова, бо інтарэсы далейшага ўмацавання калгасаў патрабавалі больш напружанай работы. Улічваючы першы вопыт у гэткай вялікай і складанай справе, партарганізацыя Беларусі ў 1939 годзе дасягнула яшчэ большага поспеху. За лета і восень мінулага года калгаснікі 110 тысяч хутарскіх гаспадарак перасяліліся ў калгасныя цэнтры і поўнасцю адбудавалі свае дамы і калгасныя двары. Але работа гэта яшчэ далёка не закончана. У 1940 годзе засталося ссяліць 44 тысячы хутароў. У адной толькі Віцебскай вобласці засталося 30 тысяч хутароў. Тав. Панамарэнка звярнуў на гэту акалічнасць сур'ёзную ўвагу большэвікоў Віцебскай вобласці.

За справаздачны перыяд у 3.601 калгасе ўведзены правільныя севазвароты. У гэтым годзе па плану трэба ўвесці севазвароты ў 2.500 калгасах. У 1941 годзе севазвароты павінны быць уведзены ва ўсіх астатніх калгасах Беларусі. Дакладчык указвае на неабходнасць устанавіць у заканадаўчым парадку адказнасць за парушэнне севазвароту.

Вялікая работа праводзіцца у галіне меліярацыі і асваення новых зямель. Амаль 30 проц. усёй тэрыторыі Беларусі заняты балотамі і забалочанымі землямі. Між тым, калі гэтыя землі асушыць і асвоіць, то ўраджай тут можна атрымаць у два—тры разы вышэйшы, чым на астатніх землях. Трэба ўсямерна распаўсюдзіць масавую калгасную меліярацыю, тым больш, што калгаснікі ў гэтым кроўна зацікаўлены.

За справаздачны перыяд значна вырасла грамадская, калгасная жывёлагадоўля. Так, за гэты час у Беларусі ў калгасах арганізавана новых 11.286 жывёлагадоўчых ферм. Пераважная большасць калгасаў рэспублікі мае па тры фермы. Адначасова вырасла і пагалоўе грамадскай жывёлы ў калгасах. Да недахопаў у галіне жывёлагадоўлі дакладчык адносіць нездавальняючае выкарыстанне племяннога маладняка і недастатковае развіццё племянной базы.

Тав. Панамарэнка прызнаў, што ў рэспубліцы велізарным недахопам з'яўляецца нізкая прадукцыйнасць жывёлагадоўлі. Сярэдні гадавы ўдой, гаворыць ён, за ўсе апошнія годы ў нас не перавышаў 900 літраў на адну карову. Павышэнне ўдою толькі на 100 літраў дало-б дадаткова для спажывання 105 мільёнаў літраў малака.

Дакладчык асобна спыніўся на тым, якое велізарнае палітычнае і эканамічнае значэнне маюць змены ў палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў, прынятыя сакавіцкім Пленумам ЦК ВКП(б).

Тав. Панамарэнка дакладвае з'езду аб уздыме матэрыяльнага дабрабыту працоўных і росквіце культуры беларускага народа. Разам з няўхільным ростам заработнай платы рабочых і служачых, ростам даходнасці калгасаў і калгаснікаў няўхільна растуць дзяржаўныя асігнаванні на асвету, ахову здароўя, жыллёвую і комунальную гаспадарку, на паляпшэнне дабрабыту гарадоў і іншыя соцыяльна-культурныя мерапрыемствы. У 1939 годзе ў справу культуры і быту беларускага народа дзяржава ўлажыла 931.100 тысяч рублёў. У 1940 годзе на гэтыя-ж мэты бюджэтам прадугледжана 1.355 мільёнаў рублёў. За гэтыя годы працоўныя Беларусі атрымалі 118 тысяч квадратных метраў жылой плошчы. Намнога ўзраслі сетка медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, лік радзільных дамоў, дзіцячых садоў, яслей і школ. Вырасла сетка грамадскага харчавання. Пабудаваны новыя гасцініцы. Аб'ём рознічнага тавараабароту ў 1939 годзе вырас да 4.073 мільёнаў рублёў супроць 2.963 мільёнаў рублёў у 1937 годзе. На 1940 год аб'ём тавараабароту мае скласці 4.757 мільёнаў рублёў.

Справаздачны перыяд характэрны бурным развіццём беларускай культуры — нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу. За адзін толькі 1939 год у школах усіх ступеней у Беларусі навучалася 1.116 тысяч школьнікаў. З вышэйшых навучальных устаноў выпушчана 3.165 спецыялістаў, з тэхнікумаў — 5.988. У Беларусі працуюць 17 тэатраў, 719 гукавых кіноўстановак, выходзіць 181 газета, у сельскіх мясцовасцях пабудавана 48 школ. 189 перадавых сельскіх настаўнікаў рэспублікі ўзнагароджаны совецкім урадам орданамі і медалямі за сваю работу па комуністычнаму выхаванню дзяцей беларускага народа.

Партыйныя арганізацыі, гаворыць дакладчык, ажыццяўляючы ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, правялі рашучую барацьбу па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на ідэалагічным і культурным фронце, і гэта ў велізарнай ступені спрыяла далейшаму росквіту культуры беларускага народа. Буржуазныя нацыяналісты—заклятыя ворагі беларускага народа, якія працавалі на адрыў Беларусі ад Совецкага Саюза, спрабавалі паставіць мастацтва на службу сваім здрадніцкім планам рэстаўрацыі капіталізма. Яны скажалі гераічнае мінулае беларускага народа, спрабавалі вытруціць з літаратуры і мастацтва ўсё, што нагадвала аб сумеснай барацьбе рускага і беларускага народаў за сваё вызваленне. Беларускі народ, які гераічна змагаўся на працягу стагоддзяў супроць польскіх і іншых парабашчальнікаў і інтэрвентаў, паказваўся як народ пасіўны і бязвольны. Буржуазныя нацыяналісты спрабавалі раззброіць народ, унушыць яму ўсведамленне бездапаможнасці.

Беларускі народ — мужны, здольны разграміць любога ворага, народ-герой, народ-змагар, які пранёс праз стагоддзі сваю культуру, сваю мову, сваю волю да перамогі, сваю нянавісць да ворагаў, народ, адданы нашай большэвіцкай партыі і совецкай уладзе, — разграміў заклятых ворагаў — буржуазных нацыяналістаў, выкарчаваў і змёў іх з твару зямлі.

Два годы таму назад Беларусь не мела ніводнай нацыянальнай оперы і балета. Зараз яна мае такія выдатныя і папулярныя ў народзе оперы, як «Міхась Падгорны» кампазітара Цікоцкага, «Кветка шчасця» кампазітара Туранкова, «У пушчах Палесся» кампазітара Багатырова, балет «Салавей» кампазітара Крошнера. Пабудаван оперны тэатр. Створан тэатральны калектыў, у якім ёсць ужо нямала актораў значнага вакальнага і драматычнага даравання. Сур'ёзных поспехаў дабілася беларуская драматургія і калектывы драматычных тэатраў. Надыходзячая дэкада тэатральнага мастацтва ў Маскве прадэманстрыруе поспехі Совецкай Беларусі ў галіне тэатральнай творчасці.

З асаблівай цікавасцю дэлегаты з'езда слухалі раздзел аб соцыялістычным будаўніцтве ў заходніх абласцях БССР. Тав. Панамарэнка далажыў з'езду, як партыйная арганізацыя Беларусі ўдзельнічала ў вызваленні адзінакроўных братоў-беларусаў ад панскага гнёту, як комуністы ў тыя гістарычныя дні дапамагалі доблесным часцям Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі выканаць загад совецкага ўрада — узяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць народа ў былой Заходняй Беларусі.

Затым дакладчык гаворыць аб чарговых задачах большэвікоў Беларусі па разгортванню соцыялістычнага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР. Там арганізавана 101 МТС. Сельская гаспадарка заходніх абласцей атрымала 2.000 конных плугоў, 1.600 культыватараў, 500 трактараў, больш 1 тысячы сеялак і шмат іншых сельскагаспадарчых машын. Беларусы ў Польшчы не мелі пачатковых школ на роднай мове. Зараз у заходніх абласцях ужо створана звыш 4.000 беларускіх школ, 8 педагагічных вучылішчаў, 4 вышэйшых навучальных установы, тэхнікумы. У Заходняй Беларусі не было ні аднаго тэатра. Зараз ёсць 7 тэатраў, створаны філармоніі, сімфанічныя аркестры, ансамблі песні і пляскі, адкрыты дамы мастака, два музыкальных тэхнікумы, музыкальныя школы і многае іншае. У 1940 годзе заходнія вобласці БССР упершыню ў гісторыі свайго існавання атрымалі соцыялістычны бюджэт. На 1940 год запраекціравана па прыбытках і выдатках 730 мільёнаў рублёў. У капітальнае будаўніцтва ўкладваецца 98,2 мільёна рублёў. На соцыяльныя і культурныя мерапрыемствы асігнуецца 400 мільёнаў рублёў. Ва ўсім гэтым сказваюцца штодзённыя клопаты совецкага ўрада, большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна аб працвітанні беларускага народа.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне былой Заходняй Беларусі на ваяводствы, паветы і валасці ліквідзіравана. Створана 5 абласцей: Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская. Створан 101 раён. У партыйных арганізацыях заходніх абласцей працуюць 9.000 комуністаў. Створана 960 пярвічных партыйных арганізацый. На раённых, гарадскіх і абласных канферэнцыях выбраны кіруючыя партыйныя органы. У заходніх абласцях таксама аформлены арганізацыі комсамола. Там працуюць 5.000 комсамольцаў. Створаны дзіцячыя комуністычныя арганізацыі — піонератрады. Партыйныя арганізацыі карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод шырокіх народных мас заходніх абласцей БССР. Праводзіцца вялікая работа па эканамічнаму асваенню прыродных багаццяў заходніх абласцей, па ўздыму матэрыяльнага і культурнага дабрабыту працоўных, па арганізацыі соцыялістычнай эканомікі. Дакладчык выразіў упэўненасць, што Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі справіцца са сваімі задачамі ў заходніх абласцях БССР.

Пасля стварэння ў парторганах ваенных аддзелаў значна палепшылася масава-абаронная работа. У 1939 годзе арганізацыі Асоавіяхіма ў рэспубліцы выраслі на 100 тысяч чалавек. Амаль на 40 тысяч чалавек узраслі арганізацыі Чырвонага крыжа. За справаздачны перыяд абароннымі арганізацыямі Беларусі падрыхтавана больш поўмільёна варашылаўскіх стралкоў, значкістаў іншых абаронных кваліфікацый, кулямётчыкаў, снайпераў, лётчыкаў. Аднак, не ўсюды партыйныя і комсамольскія арганізацыі разумеюць сваю кіруючую ролю ў абароннай рабоце. У Халопеніцкім раёне толькі 14 проц. комуністаў і 12,5 проц. комсамольцаў састаяць у Асоавіяхіме.

За справаздачны перыяд партыйная арганізацыя рэспублікі амаль падвоілася. Зараз яна налічвае 59.853 члены і кандыдаты партыі. Беларусаў у партарганізацыі — 60 проц. да агульнага складу.

(Прадаўжэнне гл. на 2 стар.)

*) Даклад друкуецца па скарочанай стэнаграме.

# XVIII З'ЕЗД КП(б)Б

## Працяг даклада тав. Панамарэнка

У асобных арганізацыях мелі месца асуджаныя партыяй метады прыёму ў партыю. Так, напрыклад, Чэрвеньскі райком партыі дапусціў у асобных пярвічных партарганізацыях групавы прыём у рады партыі, устанавіў кантрольную лічбу на прыёму, арганізаваў гутаркі, на якіх раздавалі анкеты і прысутнічаючых запрашалі ўступаць у рады партыі. Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі неадкладна выправіў становішча, а спецыяльны пленум ЦК КП(б)Б асудзіў грубае парушэнне прынцыпа індывідуальнага адбору ў партыю, якое мела месца ў партарганізацыях Чэрвеньскага, Рэчыцкага, Бабруйскага, Добрушскага і некаторых іншых раёнаў, і прыняў меры, прысякаючыя паўтарэнне падобнай антыпартыйнай практыкі.

Асобна тав. Панамарэнка спыніўся на задачах большэвіцкага выхавання кандыдатаў партыі і выніках выбараў парторганаў у Беларусі. Раённыя партыйныя канферэнцыі паказалі, што значна палепшылася работа раённых камітэтаў партыі. Калі ў мінулыя выбары нездавальняючай была прызнана работа 31 райкома, дык у сучасных выбарах такую ацэнку атрымаў 1 райком партыі — Чачэрскі. У мінулыя выбары была прызнана нездавальняючай работа 958 пярвічных партыйных арганізацый, а зараз такую ацэнку атрымалі 420 пярвічных партыйных арганізацый. І хаця гэта значна менш, чым у мінулым годзе, усё-ж раённыя камітэты партыі павінны пасіліць сваю ўвагу пярвічным партыйным арганізацыям — і вялікім, і маленькім, — каб пры будучых выбарах камуністы з поўнай падставай адобрылі работу сваіх арганізацый.

Вялікую ўвагу ўдзяліў тав. Панамарэнка пытанням марксісцка-ленінскага выхавання. ЦК компартыі Беларусі правёў значную работу па цэнтралізацыі кіраўніцтва партыйнай прапагандай. Тав. Панамарэнка гаворыць аб тым, як выконваецца пастанова ЦК ВКП(б) ад 16 жніўня 1939 года «Аб пастаноўцы прапаганды марксізма-ленінізма ў Беларускай ССР, Орлоўскай і Курскай абласцях». У сучасны момант толькі ва ўсходніх абласцях Беларускай ССР больш 100 тысяч комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных інтэлігентаў самастойна вывучаюць па «Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)» і па першакрыніцах гісторыю большэвіцкай партыі. «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» распаўсюджан у Беларусі ў колькасці больш 400 тысяч экземпляраў, а ўсяго марксісцка-ленінскай літаратуры ў 1939 годзе распаўсюджана больш 3 мільёнаў экземпляраў.

Але далёка не ўсюды партыйная прапаганда знаходзіцца на ўзроўні задач, пастаўленых ЦК ВКП(б). Ёсць яшчэ работнікі — комуністы, якія пад рознымі довадамі адкладваюць вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

За мінулы перыяд у рэспубліканскіх і абласных газетах апублікавана больш 1.200 тэарэтычных артыкулаў, лекцый, кансультацый, у тым ліку 200 артыкулаў мясцовых аўтараў. Вялікі размах атрымала лекцыйная работа. За 1939 год лектарскімі групамі ЦК, абкомаў і гаркомаў КП(б)Б прачытана каля 4.000 лекцый.

За справаздачны перыяд ЦК КП(б) Беларусі правёў вялікую работу па падбору і вылучэнню кадраў. За справаздачны перыяд вылучана на кіруючую партыйную работу 3.024 чалавекі, а ўсяго на кіруючыя пасты па дзяржаўнай і партыйнай лініі вылучана каля 30.000 чалавек, у тым ліку на работу ў заходнія вобласці —14.000 чалавек.

Дакладчык адзначыў нездавальняючае вылучэнне жанчын на кіруючую работу.

У дакладзе былі падрабязна асветлены пытанні партыйнага кіраўніцтва комсамолам. Комсамольская арганізацыя Беларусі налічвае 255.763 чалавекі. Пасля XVIII з'езда ВКП(б) комсамольскія арганізацыі павярнуліся тварам да вытворчасці, сталі актыўна ўдзельнічаць у дзяржаўным і гаспадарчым жыцці рэспублікі. Асноўны недахоп у рабоце комсамольскіх арганізацый — яны не даводзяць да канца пачатую справу. Гэта тлумачыцца тым, што яшчэ не ўсюды ў Беларусі партыйнае кіраўніцтва комсамолам стаіць на патрэбным узроўні.

Канчаючы свой даклад, тав. Панамарэнка гаворыць:

— Партыйная арганізацыя Беларусі, памнажаючы і ўмацняючы свае сувязі з масамі, выкарыстоўвае ўсе нашы велізарныя палітычныя, эканамічныя і арганізацыйныя магчымасці для таго, каб ліквідзіраваць маючыяся ў яе рабоце недахопы, яшчэ больш умацаваць граніцы, павысіць ваенную магутнасць, развіць прамысловасць, умацаваць калгасы і павысіць ураджай калгасных палёў, усямерна павысіць палітычную пільнасць і сістэматычна дапамагаць нашай разведцы карчаваць і граміць ворагаў народа, выхоўваць наш народ у духу совецкага патрыятызма і бязмежнай адданасці радзіме, партыі, таварышу Сталіну, трымаць яго ў стане мабілізацыйнай гатоўнасці, каб ніякія фокусы ворагаў не змаглі застаць нас знянацку.

Партыйная арганізацыя Беларусі была, ёсць і будзе вернай, непахіснай апорай Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)!

Няхай жыве магутны з'яднаны беларускі народ!

Няхай жыве Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі!

Няхай жыве Усесаюзная комуністычная партыя (большэвікоў) і яе Ленінска-Сталінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве таварыш Сталін!

**(Заключныя словы даклада з'езд пакрывае бурнымі апладысментамі. Уся зала ўстае. Доўга працягваецца авацыя ў чэсць Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), у чэсць таварыша Сталіна).**

## ДЗЁННІК З'ЕЗДА

**15 мая.** У Вялікай зале Дома Ўрада сабраліся дэлегаты XVIII з'езда КП(б) Беларусі. З Мінска, Беластока, з Гомеля і Брэста, з Мазыра і Пінска, — з усёй з'яднанай Беларусі сабраўся на свой большэвіцкі з'езд цвет партыйных арганізацый Рэспублікі.

Роўна а 1 гадзіне дня за сталом прэзідыума паяўляюцца члены Бюро ЦК КП(б) Беларусі т.т. Панамарэнка, Кулагін, Гракава, Кісялёў, Наталевіч, Цанава і ўпаўнаважаны Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) па БССР тав. Захараў.

Тав. Панамарэнка адкрывае з'езд кароткай уступнай прамовай.

Бурнай авацыяй, воклічамі захаплення і прывітаннямі ў чэсць таварыша Сталіна і яго саратнікаў сустракае з'езд прапанову тав. Маліна аб выбранні пачотнага прэзідыума. У пачотны прэзідыум выбіраюцца: **І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, А. А. Жданаў, Н. С. Хрушчоў, Л. П. Берыя, Н. М. Швернік.**

Прэзідыум з'езда выбіраецца ў складзе 31 чалавека, Мандатная камісія ў складзе 19 чалавек. Таксама выбіраецца Сакратарыят і Рэдакцыйная камісія з'езда.

Пасля выбрання кіруючых органаў з'езда аднагалосна зацвярджаецца прапанаваны ЦК КП(б)Б парадак дня з'езда. Парадак дня:

**1. Справаздачныя даклады: ЦК КП(б)Б — дакладчык тав. Панамарэнка, Цэнтральнай рэвізійнай камісіі — дакладчык тав. Седых.**

**2. Выбары Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.**

Старшынствуючы на вячэрнім пасяджэнні з'езда тав. Кулагін прадастаўляе слова для даклада сакратару ЦК КП(б)Б тав. П. К. Панамарэнка. У абшырным дакладзе тав Панамарэнка многімі яркімі прыкладамі паказаў велізарную работу, праробленую за справаздачны перыяд Комуністычнай партыяй (большэвікоў) Беларусі.

**16 мая.** На ранішнім пасяджэнні старшынствуе тав. Н. Г. Гракава. Слова для даклада прадастаўляецца старшыні Цэнтральнай рэвізійнай камісіі тав. Седых. У сваім дакладзе тав. Седых спыняецца на стане фінансавай і бюджэтнай дысцыпліны ў апараце ЦК КП(б)Б і партыйных арганізацыях рэспублікі.

Пасля даклада тав. Седых пачаліся спрэчкі па справаздачных дакладах Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

Першым выступае сакратар Мінскага абкома партыі тав. Матвееў.

Аб велізарных зменах у жыцці народа, вызваленага з-пад панскага іга, гаворыць у сваім выступленні тав. Аўхімовіч, сакратар Аўгустоўскага райкома партыі Беластоцкай вобласці.

На гэтым-жа пасяджэнні выступілі т.т. Зіневіч (Гомельскі паравоза-вагонарамонтны завод), сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б тав. Кісялёў, камкор тав. Ерамен-ка, сакратар Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ тав. Галоўкін.

З'езд прывітала дэлегацыя рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых фабрык, заводаў і чыгуначнага транспарту рэспублікі.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі: начальнік Беларускай чыгункі тав. Някрасаў, нарком земляробства БССР тав. Крупеня, сакратар Іванаўскага райкома КП(б)Б (Пінскай вобласці) тав. Кіштымаў, сакратар Магілеўскага гаркома КП(б)Б тав. Шуб, намеснік камандуючага Беларускай Асобай Ваеннай Акругі тав. Кузняцоў, намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Захараў, нарком тэкстыльнай прамысловасці БССР тав. Аляксееў, сакратар Ганцавіцкага райкома партыі Пінскай вобласці тав. Бейненсон.

У канцы вячэрняга пасяджэння з'езд вітала, спатканая поўнымі захаплення авацыямі залы, дэлегацыя калгаснікаў і працоўных сялян рэспублікі.

**17 мая.** На з'ездзе прадаўжаліся ажыўленыя спрэчкі па справаздачных дакладах ЦК КП(б)Б і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

На ранішнім пасяджэнні выступілі: сакратар Заслаўскага райкома партыі тав. Сацункевіч, сакратар Гомельскага абкома КП(б)Б тав. Жыжанкоў, сакратар ЦК КП(б)Б па кадрах тав. Байкачоў, сакратар Беластоцкага абкома партыі тав. Ігаеў, сакратар Вілейскага абкома партыі тав. Маргелаў, сакратар Слуцкага райкома партыі тав. Парашчанка.

З яркай, насычанай фактамі і прыкладамі прамовай выступіў цёпла сустрэты дэлегатамі народны камісар унутраных спраў БССР тав. Цанава. Аналізу становішча агітацыйна-прапагандысцкай работы ў БССР прысвяціў сваё выступленне сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе тав. Малін.

Пасля выступлення тав. Маліна старшынствуючы на з'ездзе тав. Наталевіч прадаставіў слова для даклада Мандатнай камісіі — старшыні камісіі тав. Іванову. Заслухаўшы даклад, з'езд аднагалосна пастанаўляе: даклад Мандатнай камісіі зацвердзіць.

Цёпла сустракае з'езд паяўленне ў зале дэлегацыі работнікаў навукі, літаратуры і мастацтва, прышоўшых вітаць з'езд. З хвалюючай прывітальнай прамовай выступіла заслужаная артыстка БССР тав. Ждановіч.

На вячэрнім пасяджэнні з'езда выступілі: сакратар Віцебскага абкома КП(б)Б тав. Стулаў, сакратар Магілеўскага абкома КП(б)Б тав. Макараў, сакратар ЦК КП(б)Б тав. Кулагін, сакратар Бялыніцкага райкома партыі тав. Іваненка, сакратар Кагановіцкага райкома партыі (Мінск) тав. Нікіфарава, сакратар новастворанага Чыгуначнага райкома партыі гор. Гомеля тав. Барыкін і сакратар Беластоцкага гарадскога камітэта партыі тав. Туніцын.

Пад гукі фанфар і гром апладысментаў дэлегатаў з'езда ў залу пасяджэння ўваходзіць дэлегацыя часцей Беларускай Асобай Ваеннай Акругі. З прывітальнай прамовай выступіў малодшы камандзір тав. Нечаеў. Цёпла і радушна з'езд сустракае прадстаўнікоў доблеснай Чырвонай Арміі.

**18 мая.** На ранішнім пасяджэнні ў спрэчках па справаздачных дакладах выступілі: сакратар Палескага абкома партыі тав. Кабылінскі, сакратар Любаньскага райкома партыі тав. Гуліцкі, сакратар Пружанскага райкома партыі Брэсцкай вобласці тав. Пероў, сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гракава, якая прысвяціла сваю прамову аналізу работы прамысловасці рэспублікі, сакратар Гродненскага райкома партыі тав. Пазнякоў, загадчык Аргінструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Эйдзінаў, упаўнаважаны Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) па БССР тав. Захараў, народны камісар асветы БССР тав. Уралава.

Аб поспехах у баявой і палітычнай падрыхтоўцы, аб узросшай боездольнасці часцей БАВА гаворыць член Ваеннага Совета БАВА тав. Смакачоў.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР тав. Кісялёў сваё выступленне прысвячае пытанням наладжання дысцыпліны ў совецкім апараце. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Наталевіч гаворыць аб задачах наладжвання масавай культурна-асветнай і палітычнай работы на сяле.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі: загадчык Сельскагаспадарчым аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Гласаў, сакратар Пінскага абкома партыі тав. Карасёў, загадчык Ваенным аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Прохараў, сакратар Вілейскага абкома партыі тав. Калінін, пракурор рэспублікі тав. Ветроў і тав. Мядзведзеў (Чырвоная Армія).

З'езд прымае рашэнне закончыць абмеркаванне справаздачных дакладаў ЦК КП(б)Б і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі. З заключным словам выступіў цёпла сустрэты дэлегатамі сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка.

Па справаздачнаму дакладу ЦК КП(б)Б з'езд аднадушна прыняў пастанову: **Прызнаць палітычную лінію ЦК КП(б)Б за справаздачны перыяд правільнай, практычную работу здавальняючай.** З'езд таксама аднагалосна зацвердзіў даклад Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

**19 мая.** На ранішнім пасяджэнні адбылося абмеркаванне праекта рэзалюцыі па справаздачнаму дакладу аб рабоце ЦК КП(б)Б. Пасля ўнясення раду дапаўненняў аднадушна, пад бурныя апладысменты, зацвярджаецца рэзалюцыя па справаздачнаму дакладу ЦК КП(б)Б.

З'езд прыступае да абмеркавання другога пытання парадку дня — выбараў Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі. Прымаецца прапанова нарады прадстаўнікоў дэлегацый: выбраць у склад членаў ЦК КП(б)Б — 69 чалавек, кандыдатаў у члены ЦК КП(б)Б — 45 чалавек, членаў Цэнтральнай рэвізійнай камісіі — 29 чалавек. З'езд па-дзелавому абмеркаваў кандыдатуры ў склад членаў і кандыдатаў у члены ЦК КП(б)Б і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

На вячэрнім пасяджэнні з'езда адбылося тайнае галасаванне.

**20 мая.** Доўга не змаўкаючымі апладысментамі, пераходзячымі ў авацыю, сустракае з'езд паведамленне старшыні шчотнай камісіі тав. Сямёнава аб аднагалосным выбранні членам пленума ЦК КП(б)Б вялікага правадыра партыі і народаў, лепшага друга беларускага народа таварыша Сталіна. З усіх канцоў залы нясуцца прывітальныя воклічы ў чэсць таварыша Сталіна: **«Няхай жыве вялікі Сталін!», «Няхай жыве наш любімы правадыр і настаўнік таварыш Сталін!», «Ура таварышу Сталіну!».** Авацыя напаўляецца, калі тав. Сямёнаў аб'яўляе аб аднагалосным выбранні членамі пленума ЦК КП(б)Б бліжэйшых саратнікаў вялікага **Сталіна** — т.т. **Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Жданава, Хрушчова, Берыя і Шверніка.** Дэлегаты стоячы бурнымі апладысментамі вітаюць выбранне членамі ЦК КП(б)Б баявых саратнікаў правадыра партыі.

Цёпла, дружнымі апладысментамі сустракаюць дэлегаты паведамленне аб аднадушным выбранні членам пленума ЦК КП(б)Б **тав. Панамарэнкі.**

Закрываючы з'езд, сакратар Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б тав. **Панамарэнка** звярнуўся да дэлегатаў з кароткай прамовай.



Мінская гарадская алімпіяда дзіцячай мастацкай самадзейнасці. Танец «Гапак» у выкананні вучняў 12-й мінскай школы.
Фота С. Грына.



Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР скульптар З. Азгур закончыў работу над скульптурай «І. В. Сталін у Крэмлі». **На здымку:** новая работа З. Азгура.
Фота І. Каплінскага.

## З'ЕЗД БОЛЬШЭВІКОЎ ВЫСОКА АЦАНІЎ НАШУ РАБОТУ

У справаздачным дакладзе Цэнтральнага Камітэта партыі большэвікоў Беларусі тав. Панамарэнка аддаў значнае месца пытанням беларускай культуры і мастацтва і іх дасягненням. Нас, работнікаў у галіне культуры і мастацкага слова, асабліва радуе тая ацэнка нашай работы за апошнія гады і тыя рэзультаты, якія былі паведамлены XVIII партыйнаму з'езду. Гэтыя дадатныя рэзультаты з'явіліся вынікам тых клопатаў аб работніках мастацтва і той цеплыні з боку нашага партыйнага кіраўніцтва, якімі мы былі акружаны. Гэта дае нам упэўненасць і ў далейшым працаваць з поспехам на карысць і славу нашага герайчнага працоўнага народа.

Падагуленнем нашай работы і яе вынікам з'яўляецца дэкада беларускага мастацтва ў Маскве. З вялікім хваляваннем рыхтуемся мы і чакаем гэтай дэкады. Гэта наш дзяржаўны экзамен перад усім вялікім народам совецкай зямлі, перад нашым геніяльным настаўнікам таварышам Сталіным,—экзамен строгі і без усякіх скідак. Мы спадзяемся здаць свой экзамен.

**Якуб КОЛАС.**

## ШЧАСЛІВЫ І РАДАСНЫ НАШ ШЛЯХ У БУДУЧАЕ

З вялікай цікавасцю я сачыў па газетах за матэрыяламі XVIII з'езда Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі. У дакладзе таварыша Панамарэнкі і ў іншых выступленнях на з'ездзе, як у люстры, адбіліся велізарныя дасягненні нашай краіны ў галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Мяне асабліва радуе тое, што і нашы браты з былой Заходняй Беларусі знаходзяцца сёння ў шчаслівай дружнай сям'і народаў Совецкага Саюза і сагрэты цялом сталінскіх клопатаў. Я доўгія годы марыў аб гэтым. І вось надышла часіна, калі наша слаўная Чырвоная Армія, выконваючы загад совецкага ўрада, дапамагла працоўным Заходняй Беларусі скінуць ярмо панскай Польшчы. З тае пары пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі на нашых вачах пачалі ажываць здратаваныя раней палеткі, людзі выпрасталі згорбленыя стан і весела глянулі на свет, у далячынь сваёй будучыні, буйна зазелянелі багатыя ўсходы маладой, соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме культуры. Там, дзе забаронена было беларускае слова, цяпер ёсць чатыры тысячы беларускіх школ, у якіх дзеці працоўных упершыню маюць магчымасць вучыцца на роднай мове. Адзін ужо гэты факт гаворыць аб мудрасці сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Шчаслівы той народ, перад якім ясныя мэты і шырокі шлях, які ўпэўнена крочыць па гэтаму шляху, маючы ў авангардзе мудрую і загартаваную ў баях партыю большэвікоў на чале з геніяльным правадыром народаў Іосіфам Вісарыёнавічам Сталіным.

**К. КРАПІВА.**

## У партарганізацыі ССП БССР

13 мая на адкрытым сходзе партарганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР былі заслуханы справаздачныя даклады тав. Гурскага — аб рабоце газеты «Літаратура і мастацтва» і тав. Стаховіча — аб журнале «Полымя рэвалюцыі».

Дакладчыкі расказалі аб асноўных пытаннях развіцця літаратуры і мастацтва, узнятых газетай, аб матэрыялах, якія змяшчалі газета і журнал на працягу 1939 года і першага квартала бягучага года, аб аўтарах газеты і журнала.

Даклады выклікалі ажыўлены абмен думкамі. Выступалі тт. Ільінскі, Салоўскі, Мальцінскі, Клімковіч і інш. Яны адзначылі станоўчыя моманты ў дзейнасці газеты і журнала і зрабілі рад крытычных заўваг. Газета, па думцы выступаўшых, недастаткова поўна асвятляе творчыя пытанні ўсіх галін мастацтваў, мала ўдзяляе ўвагі абаронным пытанням і рабоце маладых пісьменнікаў. Журнал зусім не займаецца пытаннямі тэорыі, не мае добрага крытычнага аддзела, мала працуе з аўтарамі па дапрацоўцы прынятых да друку твораў, не заўсёды строга падыходзіць да адбору матэрыялаў, у прыватнасці, паэзіі, спазняецца з выхадам.

**На справаздачных дакладах сход партарганізацыі прыняў разгорнутыя рашэнні.**

У рэзалюцыі аб рабоце рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» сход партарганізацыі адзначыў, што газета за апошні год значна палепшыла сваю работу. На старонках газеты ўзнят рад прынцыповых пытанняў: паказ у літаратуры і мастацтве вобразаў Леніна і Сталіна, вобразаў Орджанікідзе, Кірава, Дзяржынскага, герайчнага беларускага народа, мабілізацыя ўвагі творчых работнікаў на неабходнасць паказу ў літаратуры і мастацтве беларускага народа ва ўсёй яго веліччы. Газета сістэматычна займалася пытаннямі падрыхтоўкі да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, вядучы барацьбу за павышэнне ідэйна-мастацкай якасці твораў мастацтва. За апошні час газета правяла вялікую работу па перапрацоўцы культурнай спадчыны мінулага.

Партыйны сход указаў рэдакцыі газеты на неабходнасць далейшага паляпшэння якасці газеты, шырэйшага прыцягнення для супрацоўніцтва ў газеце творчых работнікаў, крытыкаў Масквы, Ленінграда, Кіева, Тбілісі і іншых братніх рэспублік, змяшчаць у газеце лепшыя ўзоры фальклору, прадоўжыць распачатую работу па асвятленню праблем, звязаных з культурай і развіццём беларускай мовы. У галіне тэатральнага мастацтва весці барацьбу за тое, каб кожны тэатр набыў свой мастацкі профіль, за паказ на сцэне нашых тэатраў жыцця і барацьбы беларускага народа, за выкарыстанне ў тэатрах БССР рускай і заходне-еўрапейскай класікі, за пастаноўку ў нашых тэатрах лепшых сучасных узораў драматургіі братніх народаў. Асвятляць на старонках газеты практыку работы кіно, кампазітараў, мастакоў, самадзейнага мастацтва, дапамагаючы работнікам мастацтваў у іх творчым росце.

Палепшыць асвятленне на старонках газеты партыйнага жыцця, ходу вывучэння літаратарамі і работнікамі мастацтваў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», вывучэння твораў класікаў марксізма-ленінізма. Аддаваць больш увагі распрацоўцы творчых праблем сучаснай беларускай літаратуры, сістэматычна рэцэнзіраваць журнал «Полымя рэвалюцыі». Сход лічыць патрэбным паставіць пытанне аб павелічэнні тыража і перыядычнасці газеты, а таксама стварэння рэдкалегіі газеты «Літаратура і мастацтва» з кваліфіцыраваных літаратараў і работнікаў мастацтва.

У рашэнні па справаздачы рэдакцыі журнала «Полымя рэвалюцыі» сход партарганізацыі ўказаў: звярнуць увагу рэдакцыі журнала на больш прынцыповы якасны адбор твораў, прымаемых да друку ў журнал «Полымя рэвалюцыі». Дабіцца рэгулярнасці і своечасовасці выхаду нумароў журнала. Стварыць у журнале аддзел бібліяграфіі. Папоўніць склад рэдкалегіі журнала. Весці сістэматычную работу з маладымі аўтарамі, выхоўваючы новыя кадры літаратараў.

# Няспелая паэзія

На першы погляд, у зборніку вершаў Міколы Сямашкі «Шчырасць» усё на месцы: вобразы, рыфмы, словы. Але вершы яго лёгка коўзаюцца па паверхні пачуццяў, не пакідаюць ніякага следу, не запамінаюцца.

Прычына — адсутнасць навізны, паэтычнай самабытнасці. Шматлікія недахопы зборніка відны нават няўзброеным вокам.

Шота Руставелі патрабаваў, каб «поэта речь звучала как закон». Вось гэту якасць, — будзем казаць сурова, — у «Шчырасці» трэба шукаць з агнём.

Паэтычныя вывады Сямашкі няважкія і неглыбокія. Чытаеш зборнік і мімавольна пытаешся: дзе-ж новыя, арыгінальныя, нечаканыя, прыкоўваючыя ўвагу чытача мыслі, абагульненні, без якіх немысліма літаратура высокага пафасу і страснасці? Няма іх.

«Вялікі дзень», «Пушкін», «Памяці Аляксея Максімавіча Горкага», «Вялікаму Шота Руставелі» і інш. — вершы, напісаныя па заданню, умоўна назавем іх каляндарнымі. У іх, сказаць к слову, таксама няма нічога новага, свайго, індывідуальна здабытага.

Маладыя паэты, пішучыя творы на каляндарныя даты, абыякава ставяцца да матэрыялу.

З лёгкай рукі В. Гусева ў герояў вершаў пачалі нараджацца сыны і дочкі: у аднаго героя тры, у другога—чатыры, і да бясконцасці. Гэты сюжэт сустракаецца і ў Сямашкі.

У вершы «Шчасце Наталлі», як у кандэнсатары, сабраны і паэтычная ленасць, і несамастойнасць творчых пошукаў Сямашкі.

«Над калыскай гаруе маці», «песню-смутак выводзіць», «долі-шчасця ў бога просіць». Рэвалюцыя. Замест жабрачай сумкі сыны Наталлі, — зразумела, «як дубы, кемныя, спрытныя, здатныя», — пазналі другую долю: першы стаў пілотам, другі — матросам, а трэці — брыгадзірам калгасным. Маці радуецца. Паралельна ўплятаецца і другая тэма — калгасная заможнасць. Яе паэт малюе так:

І за стол саджуся смела (?!), —
Хлеб заўсёды чысты, белы,
Госць калі, бывае, трапіць —
Маю чым пачаставаці;
І ў хляве, і ў агародзе,
І у садзе добра родзіць.

Трафарэтнасць паэтычнага замыслу вельмі моцна адчуваецца ў гэтым вершы.

Халодныя рамесніцкія адносіны да слова—што можа быць больш небяспечным для паэта? Мікола Сямашка пакуль не разумее, што адзін і той-жа, скажам, эпітэт, нават самы цікавы і новы, ужыты двойчы, губляе сваю мастацкую сілу ўздзейнічання, становіцца непатрэбнай бліскучай цацкай.

Наогул, «першаэлемент літаратуры» — лексіка — надзвычай бедная ў маладых паэтаў. Слова «песня», напрыклад, у розных варыяцыях Сямашкам ужыта 31 раз! Толькі ў адным вершы «Вялікаму Шота Руставелі» мы знайшлі шэсць «песень». Песня ў яго і ўзнятая, і бяссмертная, і магутная, і простая, і дзіўная, і жывая, і гарачая, і смелая, і бясконцая; яна і «гаворыць», і «сокалам лятае» — адным словам, робіць усё, што загадае ёй паэт.

Верш «Смерць пагранічніка» псуе кампазіцыйная рыхласць, разважлівасць паміраючага. Тут паэт, як і ў большасці сваіх вершаў, не знайшоў «залатога зярна» — мастацкай дэталі, якая-б удыхнула ў верш праўду жыцця, паэтычнае пачуццё.

Асобныя вершы М. Сямашкі вельмі нагадваюць вершы іншых паэтаў. Верш Пімена Панчанкі «Я усмешку тваю пазнаю» мае радкі:

Я гляджу на партрэт — ты пілот.
Я пагутарыць хочу з табой.
Дзе ты сёння вядзеш самалёт?
Над пустыняй? Над цёмнай тайгой?

У вершы Сямашкі «Дзе ты» сустракаемся з той-жа дзяўчынай, толькі ў яе ўжо з'явіўся «вяснушак лёгкі след», але думка паэта амаль тая-ж:

Дзе ты, у якіх такіх шыротах,
У якіх абветраных краях?...
Можа, ты ўжо водзіш самалёты,
Дзяўчына вясёлая мая?

Ёсць у М. Сямашкі і нядрэнныя вершы, напісаныя ад шчырага сэрца. Гэта— «Чаканне», «Вечар на возеры» і некалькі другіх. Іх паэт пісаў па жывому патрабаванню пачуццяў юнака. У іх ёсць і жывое слова, і назіральнасць:

Хай табе не казаў я аб тым,
Не ступіў за прызнанняў парог, —
Колькі шчырасці ў сэрцы сваім
Для адной для цябе я зберог.
Сёння-ж, мусіць, усё раскажу, —
Хай таму будзе сведкаю ноч, —
Што у думках так доўга нашу,
Што ў грудзях пасяліў так даўно.

Шкада толькі, што такіх крупінак золата ў зборніку «Шчырасць» да немагчымасці мала. Больш тут «паэтычных вольнасцей», накшталт — «А горад рагоча вачамі вітрын». Пры ўсім жаданні і намаганнях, нельга ўявіць «вітрын, рагочучых вачамі».

Паэту М. Сямашку яшчэ вельмі шмат прыйдзецца працаваць для таго, каб знайсці сваю непаўторную творчую манеру, бо наяўнасць гэтай індывідуальнай манеры вырашае поспех паэтычнага твора.

**П. ХАДАРЭНКА.**

В. ВОЛЬСКІ

# ВІЦЕБСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

Праз год пасля таго, як у Мінску быў створан першы Дзяржаўны беларускі тэатр (БДТ—1) ● Маскве ў лістападзе 1921 года, выходзячы з неабходнасці далейшага развіцця тэатральнай культуры ў БССР, быў адкрыт Дзяржаўны Інстытут сцэнічнага мастацтва.

Інстытут складаўся з двух студый — беларускай і яўрэйскай.

Пасля пяцігадовага навучання і сцэнічнай практыкі склад беларускай студыі ў колькасці 34-х чалавек быў аформлен у якасці самастойнай тэатральнай адзінкі — другога Дзяржаўнага беларускага тэатра (БДТ—2) з пастаянным прабываннем у гор. Віцебску.

Свой першы сезон тэатр адкрыў у Віцебску 21 лістапада 1926 года. К моманту адкрыцця першага сезона рэпертуар Віцебскага Дзяржаўнага беларускага тэатра складаўся з наступных п'ес: «Цар Максімільян» — па тэксту А. Рэмізава, «Сон у летнюю ноч» Шэкспіра, «Эрос і Псіхея» Жулаўскага, «Вакханкі» Эўрыпіда і некалькі інсцэніровак-мініяцюр, падрыхтаваных у парадку вучэбнай работы.

Высокае майстэрства акторскага выканання ўжо з першых дзён існавання тэатра паказала гледачу, што малады калектыў арганічна засвоіў спадчыну рускай тэатральнай культуры і, у першую чаргу, сцэнічны вопыт тэатраў Масквы. Аднак, варожыя нацыяналістычныя элементы спрабавалі выкарыстаць малады тэатр у мэтах ідэйна-чуждага, буржуазна-нацыяналістычнага ўздзеяння на гледача.

З гэтай мэтай падбіраўся для тэатра і адпаведны «арыгінальны» рэпертуар, які складаўся з п'ес, нявартых нават і ўспаміну. З рэакцыйных пазіцый трактаваліся на сцэне тэатра ў першыя годы яго існавання і творы класікі.

Няправільная лінія, праводзімая кіраўніцтвам тэатра, сустракала нездаволенне і супрацьдзеянне з боку калектыва, які не жадаў ісці па шляху адрыву ад рэчаіснасці. Гэтае нездаволенне знаходзіла сабе пацвярджэнне ў шматлікіх крытычных выступленнях прэсы, накіраваных супроць рэакцыйных ідэйна-мастацкіх пазіцый, занятых кіраўніцтвам тэатра. У рэзультаце тэатральнай дыскусіі, якая разгарнулася вакол пастановак тэатра ў часе другога сезона, нацыяналістычнае кіраўніцтва Віцебскага тэатра было знята. Перад тэатрам была пастаўлена задача прыступіць да работы над лепшымі творамі савецкай драматургіі.

Неабходны пералом быў хутка дасягнут. У 1928 годзе ў Віцебскім тэатры адбылася прэм'ера п'есы «Разлом» Б. Лаўрэнёва (пастаноўка рэжысёра С. Радзанава, мастак Ю. Гольц), якая заняла выдатнае месца ў рэпертуары тэатра і карыстаецца да гэтага часу заслужаным поспехам у гледача. Гэта была вялікая, не толькі творчая, але і палітычная перамога тэатра.

У гэтым спектаклі ўпершыню асабліва ярка на сучасным матэрыяле праявілася вялікае дараванне такіх майстроў беларускай сцэны, як А. Ільінскі, П. Малчанаў і іншыя.

Бліскучым вырашэннем масавых народна-рэвалюцыйных сцэн на крэйсеры, стварэннем цэлага раду маляўнічых вобразаў, тыпаў і характараў матроскага калектыва тэатр зноў, і на гэты раз моцна, заваяваў сабе страчаную ўжо было папулярнасць.

У «Разломе» акторскі калектыў Віцебскага тэатра даказаў сваё жаданне і сваю здольнасць ствараць жывыя, яркія рэалістычныя вобразы герояў народнай масы, герояў сучаснасці.

Следам за «Разломам» на сцэне Віцебскага тэатра на працягу 1928—30 год былі пастаўлены п'есы «Калі спяваюць пеўні» Юр'іна і «На прадвесні» беларускага драматурга М. Ільінскага.

П'еса «На прадвесні» была напісана Ільінскім на матэрыяле сучаснай беларускай вёскі напярэдадні калектывізацыі. У п'есе былі адлюстраваны моманты класавай барацьбы ў вёсцы. У спектаклі быў шырока выкарыстан сучасны беларускі фальклор па запісах, зробленых у Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці.

Працуючы на сучасным драматургічным матэрыяле, Віцебскі тэатр устанаўлівае цесную сувязь з працоўным гледачом. Тэатр упарта шукае новых творчых шляхоў, новых форм сувязі з гледачом, з фабрыкамі і заводамі, з воінскімі часцямі.

Рашучыя зрухі далі ў гэтых адносінах сезон 1930—31 года, праведзены тэатрам у Мінску.

Новыя спектаклі, падрыхтаваныя тэатрам у гэты час, — «Першая конная» В. Вішнеўскага (пастаноўка рэж. В. Тэзароўскага, мастак Матрунін, музыка Старакадомскага) і «Качагары» беларускага драматурга І. Гурскага (пастаноўка рэж. Міцкевіча, мастак Ю. Гольц) былі шырока выкарыстаны Віцебскім тэатрам для разгортвання грамадска-палітычнай работы з гледачом.

Ганаровы чырвоны сцяг, атрыманы тэатрам за пастаноўку «Першай коннай» ад часцей Мінскага гарнізона, вялікая колькасць адрасоў і грамат ад Дома Чырвонай Арміі сведчылі аб гэтым.

У 1931 годзе Віцебскі тэатр з поспехам ажыццяўляе гастрольную паездку ў Маскву і Ленінград, паказаўшы працоўным двух буйнейшых цэнтраў Савецкага Саюза поспехі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі. У часе гэтых гастролей тэатр паказаў «Разлом» Лаўрэнёва, «Першую конную» Вішнеўскага, «Качагары» Гурскага і «На прадвесні» Ільінскага.

Работа над рэалістычным, жыццёва-праўдзівым матэрыялам абумовіла першыя значныя поспехі Віцебскага тэатра. Калектыў тэатра канчаткова пераканаўся ў тым, што толькі ідэйна і мастацка поўнацэнная п'еса можа спрыяць яго далейшаму творчаму росту.

Між тым, некаторыя рэжысёры, якія працавалі ў тэатры, не разумелі яшчэ таго, што п'еса з самымі перадавымі ідэямі можа быць абясцэнена і нават ператворана ў сваю супрацьлегласць фармалістычнай трактоўкай пастаноўшчыка.

Іменна гэта і здарылася з некаторымі пастаноўкамі Віцебскага тэатра. У працэсе работы над «Качагарамі» (рэжысёр Н. Міцкевіч) тэатр праявіў схільнасць да схематызма і плакатнасці. Глыбока мастацкае раскрыццё з'яў рэчаіснасці было падменена ў гэтым спектаклі лозунгаваснцю, павярхоўнай схемай, чаму ў значнай ступені спрыяла захапленне пастаноўшчыка прыёмамі і метадамі работы ТРАМ'аў.

Фармалістычнай аказалася і адна з наступных па часу пастановак тэатра—«Жаніцьба Фігаро».

Але тэатр змог перамагчы гэтыя рэцыдывы фармалізма і стаць на пазіцыі рэалістычнага мастацтва. Аб гэтым можна меркаваць па такіх пастаноўках тэатра, як «Байцы» Б. Рамашова (рэжысёр В. Дарвішаў), «Гібель эскадры» А. Карнейчука (рэжысёр засл. арт. РСФСР К. Зубаў) і «Беспасажніца» А. Астроўскага (рэжысёр В. Дарвішаў).

Грамадскасць БССР ацаніла поспехі тэатра. Віцебскі тэатр быў занесен у ганаровую чырвоную кнігу імя XI з'езда Саветаў БССР.

З гэтага часу пачынаецца планамерная, сістэматычная работа тэатра з беларускімі драматургамі. Да работы над стварэннем арыгінальнага рэпертуару тэатр прыцягвае аднаго з буйнейшых майстроў беларускага мастацкага слова — народнага паэта БССР Якуба Коласа.

У 1936 годзе адбылася прэм'ера п'есы Коласа «Вайна» (пастаноўшчык В. Дарвішаў), напісанай для тэатра і прысвечанай вайне 1914—18 года ў Беларусі.

Адначасова з гэтым тэатр звяртаецца і да твораў беларускай дарэвалюцыйнай спадчыны ў галіне драматургіі. Рэжысёр П. Малчанаў ажыццяўляе пастаноўку невялікай сатырычнай камедыі беларускага пісьменніка мінулага стагоддзя Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта», а таксама дарэвалюцыйных вадэвіляў народнага паэта БССР Янкі Купалы «Паўлінка» і «Прымакі». Працуючы над гэтымі п'есамі, тэатр стварыў рэалістычныя спектаклі з яркім нацыянальным каларытам.

Значнае месца ў рэпертуары тэатра заняла і пастаноўка наступнай п'есы Коласа «У пушчах Палесся» (пастаноўка В. Дарвішава), якую тэатр ажыццявіў у 1937 годзе да XX-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У аснову п'есы быў пакладзен змест папулярнай аповесці Коласа «Дрыгва». У гэтым творы былі адлюстраваны поўныя сапраўднага драматызма эпізоды гераічнай барацьбы беларускага народа супроць польскіх акупантаў у 1920 годзе.

Цэнтральным вобразам п'есы з'явіўся вобраз Талаша, старога і лагоднага беларускага дзеда з дрымучых пушчаў Палесся, які вырастае ў працэсе барацьбы з польскімі захватчыкамі ў кіраўніка партызанскага атрада. У вобразе дзеда Талаша ўдала ўвасоблены ўсе лепшыя рысы беларускага народа—яго сумленнасць, гераізм, рахманасць, мудрасць і гумар, любоў да сваёй радзімы і нянавісць да яе адвечных ворагаў і прыгнятальнікаў,—польскіх паноў. Вобраз дзеда Талаша знайшоў сабе выдатнага выканаўца ў асобе народнага артыста БССР А. К. Ільінскага.

З твораў рускай драматургіі былі ў гэты час пастаўлены «Дзеці Ванюшына» С. Найдзёнава (пастаноўшчык Ц. Сяргейчык) і «Мяшчане» М. Горкага (пастаноўка І. Віньяра і Б. Тамарына).

Усімі гэтымі спектаклямі Віцебскі тэатр даказаў сваю творчую спеласць, сваё ўменне раскрываць вялікія грамадска-палітычныя ідэі сродкамі сапраўднага мастацтва, увасабляючы іх на сцэне ў яркія, жыццёвыя і па-мастацку пераканальныя вобразы.

Вялікім поспехам тэатра з'явілася ў гэтых адносінах пастаноўка ў 1938 годзе п'есы Пагодзіна «Чалавек з ружжом» (пастаноўка І. Віньяра і Б. Тамарына). У гэтым спектаклі ўпершыню былі паказаны на беларускай сцэне вобразы вялікіх правадыроў сацыялістычнай рэвалюцыі—Леніна і Сталіна (у выкананні нар. арт. БССР Ільінскага і засл. арт. БССР Малчанава).

Малчанаву ўдалося ўнавіць на сцэне многія характэрныя асаблівасці і рысы бясконца дарагога савецкаму гледачу ленінскага аблічча. Тую-ж задачу ўдалося вырашыць і Ільінскаму ў не менш адказнай ролі Сталіна.

Праўдзівы і жыццёвы вобраз салдата Івана Шадрына стварыў у гэтым спектаклі засл. арт. БССР Н. Звездачотаў.

У 1939 годзе тэатрам была пастаўлена п'еса памёршага беларускага пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка «Пагібель воўка».

Лінію работы над вобразамі правадыроў рэвалюцыі, так удала пачатую ў «Чалавеку з ружжом», тэатр прадоўжыў у пастаноўцы вершаванай п'есы паэта-ордэнаносца П. Глебкі «Над Бярозай-ракой».

Драматычная паэма Глебкі прысвечана аднаму з гераічных эпізодаў барацьбы беларускага народа супроць польскіх акупантаў у 1919 годзе і ўдзелу ў гэтай барацьбе бліжэйшага паплечніка і друга вялікага Сталіна — Серго Орджанікідзе.

Вобраз Серго Орджанікідзе (у выкананні засл. арт. БССР Звездачотава) займае ў гэтай п'есе вядучае месца.

Беларускі народ разам з Чырвонай Арміяй пад кіраўніцтвам пасланца вялікага Сталіна, слаўнага Серго, разбівае ворага. Гэтыя гістарычныя падзеі паказаны ў спектаклі рамантычна-узнёсла і ў той-жа час рэалістычна-праўдзіва.

Апошнія работы тэатра сведчаць аб тым, што Віцебскі драмтэатр глыбока і арганічна авалодаў метадамі рэалістычнага мастацтва. Гэтаму не мала спрыяла паслядоўная работа тэатра над тэмамі вялікай сацыяльнай значымасці. Тэатр вырас творча вышэй, даказаў, што здольны вырашаць сродкамі сапраўднага майстэрства вялікія і адказныя мастацкія задачы.



Гомельскі абласны рускі драмтэатр за шэсць месяцаў свайго існавання паставіў пяць п'ес. **На здымку:** сцэна з 1-га акта п'есы А. П. Чэхава «Чайка» ў пастаноўцы нар. арт. СССР ордэнаносца Л. М. Леанідава. У ролі Трэплера арт. **І. В. Рукавіцын** (злева), у ролі Сорына— арт. **В. П. Глазуноў.**

Фота М. Савіна (БЕЛТА).

## ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

Новаарганізаваны Дом Чырвонай Арміі яшчэ толькі пачынае сваю работу, але ў яго актыве ўжо ёсць рад цікавых мерапрыемстваў. Амаль штодзённа для байцоў, каманднa-палітычнага складу і іх сямей праводзяцца лекцыі — аб знешняй і ўнутранай палітыцы СССР, аб літаратуры, аб жыцці і дзейнасці выдатных рэвалюцыянераў, у дапамогу вывучаючым гісторыю ВКП(б) і г. д.

Шмат увагі аддаюць палітработнікі ДЧА мастацкай самадзейнасці. Сіламі драматычнага гуртка, жаночага хора, вакальнай і танцавальнай групы падрыхтаван вялікі і змястоўны канцэрт.

Ініцыятарам і арганізатарам чырвонаармейскай самадзейнасці з'яўляецца інструктар ДЧА малодшы камандзір тав. Мышасты, які да арміі працаваў акторам. Ён любоўна і ўважліва адносіцца да сваёй справы. Нельга адмовіць яму і ў акторскіх здольнасцях. Яго канферанс заўсёды вясёлы, сціслы, зацейлівы. Выступаючы чытальнікам, ён заклікае на дапамогу мастацкаму слову жэст, рух, міміку. Таму так добра ўспрымаюцца чытаемыя ім творы В. В. Маякоўскага «Стихи о советском паспорте» і «Блэк энд уайт».

Пастаўлены тав. Мышастым вадэвіль А. П. Чэхава «Ведзьма» вырашан сцэнічна граматна. Але выканаўцы, нажаль, некалькі павярхоўна зразумелі Чэхава.

Чырвонаармеец тав. Улімаў валодае лірычным тэнарам. Толькі, відаць, выканавец залішне захапляецца джазавай музыкай, таму нават класічны раманс Варламава «Белее парус», напісаны на словы Лермантава, ён выконвае на джазавы манер.

Жонка камандзіра тав. Самакрутава нядрэнна выконвае жартаўлівую украінскую песню «Еўтуша».

Песням і пляскам не пашанцавала ў праграме канцэрта. Глядач не ўбачыў новых плясак. Зноў «Гапак», «Цыганачка». А хацелася-б убачыць чырвонаармейскія пляскі і багатыя народныя танцы шматнацыянальнага Савецкага Саюза.

Першая канцэртная праграма новага ДЧА была зборнай. Пажадана, каб наступныя праграмы былі больш тэматычнымі. Сілы для гэтага ёсць.

Танцавальны гурток пачаў ужо работу над другой праграмай. Развучвае песні і хор. Драмгурток рыхтуе п'есу В. Гусева «Слава». Спектакль ставіць тав. Мышасты.

Энтузіясты чырвонаармейскай самадзейнасці любяць мастацтва, цэняць яго і любоўна нясуць сваё майстэрства ў масы.

**А. ЕСАКОЎ.**

# У барацьбе за творчыя поспехі

***Насценгазета Мінскага Дзяржаўнага драмтэатра***

Насценная газета, як выразіцельніца грамадскай думкі пэўнага калектыва, можа адыграць вялікую ролю ў ажыццяўленні задач, якія перад гэтым калектывам стаяць. Для гэтага патрэбны дзве ўмовы: каб газета выходзіла рэгулярна і каб пытанні, якія ўзнімаюцца газетай, насілі глыбокі, прынцыповы характар.

Насценная газета калектыва Мінскага Дзяржаўнага драмтэатра «За авансцэнай» у значнай ступені адпавядае гэтым патрабаванням. Яна выходзіць рэгулярна, праўда, параўнальна рэдка — раз у месяц, і ўзнімае рад прынцыповых пытанняў творчай работы тэатра.

Калектыў тэатра добра разумее, што ўрад БССР аказаў яму вялікае давер'е, даручыўшы дэманстрыраваць у Маскве дасягненні драматычнага мастацтва Савецкай Беларусі. Калектыў вядзе актыўную барацьбу за паляпшэнне ўсёй работы тэатра, за новыя творчыя дасягненні сцэнічнага мастацтва. Гэта барацьба знаходзіць яркае адлюстраванне на старонках насценнай газеты.

«Падрыхтоўка да дэкады, работа над дэкаднымі спектаклямі павінна праходзіць пад знакам любоўнай і ўважлівай шліфоўкі кожнай дэталі, кожнага крока на сцэне. Усякая, хоць-бы і нязначная, недапрацоўка абавязкова ляжа плямай на ўсю работу, з якой мы прадстанем у сталіцы».

Так фармуліруе адзін з аўтараў насценгазеты задачы калектыва, і тут-жа ў пацвярджэнне сваіх слоў указвае на рад прабелаў, якія мелі месца ў пастаноўцы «Пагібелі воўка».

У свой час насценная газета звярнула сваю ўвагу на адсутнасць творчых дыскусій, калектыўнага абмеркавання спектакляў, адсутнасць творчых справаздач актораў і абмеркавання іх работы. Газета правяла вельмі цікавую дыскусію аб музычным афармленні спектакляў свайго тэатра.

Многа ўвагі аддае насценгазета творчай і працоўнай дысцыпліне, змагаецца з метадамі рамесніцтва, з казённа-бюракратычнымі адносінамі да творчых задач.

«Нязменная рыхласць масавых сцэн з прычыны недапушчальных адносін да іх з боку большасці ўдзельнікаў і недастаткова ўважлівая прапрацоўка іх рэжысёрамі — з'яўляецца нязменным спадарожнікам амаль кожнага нашага спектакля. Рассеянасць, няўважлівасць на рэпетыцыях, абыякавыя адносіны да работы, спазненні на рэпетыцыі і на выхад у часе спектакляў—няхай яны носяць адзінкавы характар, — усё-ж існуюць» — сігналізіруе газета.

Падводзячы вынікі сезона 1939 — 40 года, насценгазета побач з новымі поспехамі тэатра адзначае ў радзе артыкулаў і буйныя недахопы, вызначае шляхі да іх ліквідацыі. Большасць артыкулаў вылучаецца глыбокай прынцыповасцю, смеласцю меркаванняў, крытыкай не гледзячы на асобы.

«... Буйным недахопам у рабоце нашага тэатра, — піша насценгазета, — з'яўляецца тое, што рэжысёр часта прыходзіць на рэпетыцыі непадрыхтаваным. Кожная рэпетыцыя павінна быць свежай, новай для актора — у сэнсе яго творчых пошукаў, а атрымліваецца фармальны прагон — «забалбтыванне» тэкста».

Насценгазета сігналізіруе аб вельмі небяспечным з'явішчы, свайго роду дэпрэсіі, пасля выхаду спектакля.

«З выхадам спектакля, — указвае газета,—усе творчыя пошукі альбо спыняюцца, альбо пазбаўленыя кантролю рэжысёра, прымаюць выпадковы характар і вядуць па шляху не заўсёды прыемлемых эксперыментаў».

Сваю крытыку насценгазета накіроўвае па адрасу канкрэтных асоб — актораў, рэжысёраў, адміністратараў, рэзка асуджаючы нясмелыя непрынцыповыя выступленні паасобных членаў калектыва ў часе абмеркавання спектакляў, баязнь пакрыўдзіць, замоўчванне недахопаў, «слепыя» падыход да ацэнкі работы рэжысёраў—заслужаных і народных артыстаў.

Побач з творчымі пытаннямі насценгазета ўзнімае і рад іншых, цесна звязаных з усім комплексам пытанняў работы тэатра.

Нам хочацца адзначыць выступленне ў насценнай газеце народнага артыста БССР тав. Уладамірскага з заклікам да калектыва сур'ёзна ўзяцца за вывучэнне гісторыі партыі. «Мы, работнікі мастацтваў, — піша тав. Уладамірскі, — асабліва ясна павінны зразумець важнасць вывучэння гэтага багатага гістарычнага матэрыяла нашай партыі і штодзённа вывучаць яго».

Крытыкуючы таварышоў, якія не пайшлі на лекцыю аб дыялектычным матэрыялізме, тав. Уладамірскі піша:

«Няўжо ўсё жыццё і шчасце нашага актора грунтуецца на ўдалай, добрай ролі, на зарплаце і іншых бытавых спрыяючых умовах і задавальненнях? Чаму мы так інертны і працуем, як чыноўнікі? Скіньце з сябе бытаўшчыну і інертнасць, будзьце будаўнікамі свайго шчасця, свайго дабрабыту — на карысць агульнай справы».

Няма сумнення, што гэты шчыры заклік не застанецца непачутым.

Шмат увагі аддае насценгазета абаронным пытанням, падтрымлівае цесную сувязь з моладдзю тэатра, прызванай у Чырвоную Армію.

Звяртае на сябе ўвагу вялікая колькасць вельмі граматных, дасціпных вершаваных фельетонаў, яркае афармленне— мноства добра выкананых карыкатур, якія б'юць у адно: узняць калектыў на такую палітычную і маральную вышыню, якая забяспечвала-б творчыя перамогі тэатра і спрыяла стварэнню спектакляў, вартых нашай сталінскай эпохі.

**І. ПРАЎДЗІН.**



**Самадзейнае мастацтва заходніх абласцей БССР.** Музыкальная сям'я Андрушкевічаў з в. Гідаўка Навагрудскага раёна Баранавіцкай вобласці. Фота І. Каплінскага.

М. СМОЛКІН

# АПОВЕСЦЬ ПРА МАЛЕНСТВА

***„У дрымучых лясах“ З. Бядулі***

Характэрнай асаблівасцю творчасці З. Бядулі з'яўляецца, на наш погляд, злучэнне рэалізма з рамантызмам. Прызнаны рэаліст і бытаапісальнік З. Бядуля дазваляе свайму герою калі-ні-калі глянуць на «свет» праз каляровае шкло... І тады перад нашымі вачыма знаёмая ваколіца ператвараецца ў казачны малюнак, лясы, людзі, неба, азёры, жывёла і птушкі набываюць новыя колеры. Мова аповесці, асабліва ў месцах, якія датычаць легенд альбо казак-быляй, набывае, мы-б сказалі, нейкую ўрачыстасць, асаблівую задушэўнасць. Героя аповесці — хлапчука цікавяць людзі, якія ўзвышаюцца над аднатонным жыццём і вылучаюцца нечым надзвычайным.

Для нас аповесць «У дрымучых лясах», апрача яе вялікага пазнавальнага значэння, цікава яшчэ і тым, што яна, кідаючы рэтраспектыўнае святло на творчасць З. Бядулі, дае магчымасць зразумець напрамак творчага шляху пісьменніка. Але, каб падысці да гэтага пытання, неабходна ўясніць сабе цяжкасці аўтабіяграфічнага жанру, у якім напісана гэта аповесць.

Своеасаблівы характар мастацкай аўтабіяграфіі выразна адчуваў Талстой, калі пісаў «Детство»: «Принятая мною форма аўтабіяграфіі і прымусовая сувязь наступных частак з папярэдняй стрымлівае мяне так, што я часта адчуваю жаданне кінуць іх і пакінуць апошнюю без працягу».*)

Цяжкасць стварэння аўтабіяграфічнай аповесці, якая апісвае маленства, заключаецца ў тым, што ўсе здарэнні неабходна даваць праз успрыняцце дзіцяці, ні на хвіліну не забываючы ўласцівай яго ўспрыняццю канкрэтнасці і акрэсленасці дэталей. Ні адзін факт не можа выступаць сам па сабе, як у звычайнай апавядальнай форме. Паданыя праз псіхіку дзіцяці з'явы рэчаіснасці афарбоўваюцца ў своеасаблівыя эмацыянальныя тоны і перадаюцца звычайна праз дзіцячыя разважанні. І пісьменніку цяжка бывае захаваць усюды гэты спецыфічны дзіцячы тон. Паслядоўна не захоўвае мовы дзіцяці і З. Бядуля. Так, напрыклад, З. Бядуля вельмі ўдала перадае адценні дзіцячай псіхалогіі.

Хлапчык прыкідваецца «хворым», яму імпаніруе, што маці ўсю ўвагу аддае «хвораму», але яму і шкада маці, якая так пакутуе. Ідзе разважанне малога хлапчука: «Мне становіцца шкада яе. Яна так пакутуе з-за мяне, з-за майго кашлю. Пастараюся больш ніколі не кашляць, я сцісну зубы так моцна, што задушу свой кашаль, задушу, як гадзюку. Мне гэты спосаб лячэння пачынае падабацца...»

«Але-ж у гэту хвіліну я так закашляўся, што прыйшлося мне пакінуць на ўзвей-вецер такое цікавае адкрыццё ў медыцыне».

Так можа разважаць толькі дарослы. І так у радзе месц аповесці мы наглядаем змяненне інтанацыі. У аповесці, дзякуючы выбранай аўтарам форме, адсутнічае ўнутраная дынаміка, абумоўленая развіццём фабулы так, як мы гэта назіраем у «Салаўі», дзе драматычная напружанасць фабулы ўвесь час штурхае к развязцы.

Аповесць «У дрымучых лясах» звязана не рухам здарэнняў, утвараючых фабулу, а паслядоўнасцю асобных сцэн, змяняючых адна другую. Успаміны пра асобныя эпізоды з жыцця змяняюцца, як кадры ў кінофільме. Знешне паміж персанажамі аповесці няма сувязі, не ўсе яны маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі галоўнага героя, аповесць мае і рад устаўных навел («Палкоўнік»). Але пры ўсіх гэтых асаблівасцях, якія ўласцівы не толькі аповесці З. Бядулі, твор «У дрымучых лясах» не пакідае ўражання кампазіцыйнай рыхласці, цікавасць чытача да розных частак аповесці аднолькава вялікая, бо адчуваецца ўнутраная сувязь паміж такімі людзьмі, як бацька, дзед Лэйзар, бондар Даніла, удава Марта, дзед Мірон. Іх звязвае гаротны лёс, тое, што ўсе яны жывуць «у дрымучым лесе», поўным звяроў у вобразе паноў Мыслінскіх і Чапкоўскіх. Гэты лейтматыў тэмы «дрымучага лесу» праведзен праз усю аповесць і звязвае яе ў адзінае цэлае.

Калі мы ўвесь час гаворым пра аповесць «У дрымучых лясах» у параўнаўчым плане і ўспамінаем «Детство» Талстога, то мы гэтым зусім не хочам сказаць, што З. Бядуля ва ўсім следуе Талстому. Форма аўтабіяграфіі дае матэрыял для параўнання, але пры гэтым трэба падкрэсліць тое новае, што ўносіць пісьменнік у самае разуменне аўтабіяграфічнага жанру.

Увесь сэнс «Детства» Талстога заключаецца не ў дзеянні героя, не ў яго адносінах да акружаючых людзей. Для Талстога важна барацьба супярэчлівых адчуванняў, змена настрою ў чалавеку і, галоўнае, што цікавіць Талстога ў Нікаленьку Іртэньеву, гэта дыялектыка думак і пачуццяў. У «Детстве» мы бачым пачатак развіцця дзіўнага таленту Талстога, які заключаўся ва ўменні раскрыць душу героя, паказаць чытачу, як нараджаецца тое альбо іншае пачуццё, даць псіхалагічную матывіроўку гэтаму пачуццю.

У адной сцэне (дзеці назіраюць за юрадзівым Грышам) Талстой здолеў перадаць усе адценні пачуцця: сумесь дзіцячага здзіўлення, жаласці і захаплення. Усё жыццё Нікаленькі Іртэньева працякае роўна і бесклапотна, ён не разумее, што такое беднасць, не ведае, як зроблены тыя прадметы, якімі ён карыстаецца. Што такое праца — гэта пытанне застаецца для героя Талстога нявырашаным, ён толькі здалёку, едучы на паляванне, бачыць сагнутыя спіны сялян, але гэта не затрымоўвае яго ўвагі. У маленстве Нікаленька марыць стаць генералам, ажаніцца на цудоўнай красуні, купіць сабе рыжага каня, пабудаваць шкляны дом. Характэрная рыса героя «Детства» — зацікаўленасць самім сабою і рэзка выражаны індывідуалізм. Сярод іншых «непрыемнасцей» маленства адно з самых «вялікіх» — яго непрыгожы твар. «Я прасіў бога зрабіць цуда — ператварыць мяне ў прыгажуна, і ўсё, што меў цяпер, усё, што мог мець у будучым, я ўсё аддаў-бы за прыгожы твар».

«Шчаслівая пара маленства», — вось лейтматыў аповесці Талстога.

Прынцыпова новым у аповесці З. Бядулі з'яўляецца тое, што ўся ўвага пісьменніка сканцэнтрыравана не на суб'ектыўных псіхалагічных перажываннях яго героя, а на асяроддзі, якое акружае яго. Тэма «дрымучага лесу» з'яўляецца цэнтральнай у аповесці З. Бядулі і вызначае сабою ўсе іншыя сюжэтныя лініі твора.

Маленства З. Бядулі праходзіць «у людзях», якія знаходзяцца ў вечным страху перад магчымасцю галоднай смерці. Справа ідзе аб зусім іншым сацыяльным асяроддзі, існаванне ў якім не можа пакінуць у першапачатковай цэласнасці душу чалавека. Пра абяздоленае маленства, якое праходзіць у абстаноўцы сацыяльнай несправядлівасці, першым у рускай літаратуры напісаў А. М. Горкі. І там ужо намеціў ён іншы погляд на героя. У З. Бядулі гэта пераключэнне ўвагі з героя на асяроддзе вельмі выразна падкрэслена. Нельга сказаць, каб З. Бядулю не цікавіла псіхалогія дзіцяці. Дастаткова ўспомніць вельмі ўмела адзначаныя рысы эгацэнтрызма, якія ўласцівы дзецям. Чытайце раздзел «Доўгакрылы бусел».

«У гэты час доўгакрылы бусел прынёс мне з неба ў хату першую сястрычку Марыю. Я вельмі злаваўся на доўгакрылага бусла. Навошта яму было прыносіць сюды маленькую Марыю? Няхай-бы яна жыла сабе над воблакамі. Справа ў тым, што са з'яўленнем Марыі ўся ўвага маці і бабулі была аддадзена ёй...

Ах, гэты бусел! Ён бязлітасна разбурыў мой супакой».

І адразу-ж дзіцячае «абагульненне»: «Усе мне здрадзілі, усе мяне забылі». Гэтае адчуванне, вядома, хутка пройдзе і хлапчука зноў зоймуць ножычкі і пісталеты.

Альбо такая псіхалагічная тонкасць, падмечаная З. Бядуляй. Каваль Гірша-Меер — дужэйшы чалавек у ваколіцы. Ён — герой хлапчуковых дум, «аднак, Гірша-Меер мне не зусім падабаецца. Гэта з таго часу, калі я ў яго кузні наступіў босай нагой на гарачы кавалак жалеза». Але-ж у перадачы псіхалогіі маленства сіла аповесці З. Бядулі і таму мы наўмысля абмяжуем прыклады з аповесці, малюючыя праяўленне дзіцячай псіхалогіі. Жыллёвыя ўмовы, акружаючыя дзяцей «з пізоў», падштурхоўвалі іх міжволі на мыслі аб сіле чалавечых рук, якія ўсё могуць стварыць. Гэту павагу дзяцей да працы непараўнаўча паказаў А. М. Горкі. З якім захапленнем глядзеў ён на спрытныя рукі масцеравога Цыганка, красільшчыка і весельчака.

У аповесці «У дрымучых лясах» гэта горкаўская тэма захаплення сілай чалавечай працы толькі закранута, але яна настолькі важна для ўсёй нашай літаратуры, што мы на ёй спынімся спецыяльна.

Напомнім, што З. Бядуля ўжо аднойчы праспяваў гімн працы. Мы маем на ўвазе яго лірычную навелу «Бондар». Гэта навела ёсць апафеоз чалавечай працы. Работа бондара Данілы паказана, як натхненне, як акт найвялікшай творчасці.

Маленства хлапчука — героя аповесці «У дрымучых лясах» праходзіць сярод людзей працы: матка шые кашуры, дзед — меднік і ўсё мястэчка масцеравых і сялян. «Абход мястэчка» — гэта абход яго людзей, якія дзякуючы свайму майстэрству могуць рабіць вельмі цікавыя рэчы; тут і шавец, і столяр, які ўвесь час трымаў поўны рот драўляных цвікоў (дэталь вельмі характэрная для Бядулі), тут і майстар на ўсе рукі рыжавусы Янка, і многа іншых людзей розных спецыяльнасцей.

У перавазе і сіле працы хлапчук пераконваецца і на сваім вопыце. Ніхто іншы, а дзядзька Янка выратоўвае хлапчука ад ганебнага абавязку прымерваць на сваёй галаве кашуры. Столяр робіць сасновы чурбанчык для кашурніцы, і справа вырашаецца вельмі проста.

У мястэчку жыў камфнік Вышамірскі. Дзесяткамі год гэты своеасаблівы аматар харaства не пакладаючы рук працаваў на сваім кавалачку зямлі, які ператварыў у надзвычайна прыгожы куток.

Гэтыя факты не могуць не пакінуць следу ў свядомасці падрастаючага чалавека.

Аб сіле чалавечага калектыва, у якім усе працуюць, расказвае хлапчуку незнаёмы з Мінска. Гэта быль прасякнута верай у калектыўную працу. Чалавек не захацеў хадзіць пехатой, яму хацелася шпарка перабірацца з горада ў горад, з вёскі ў вёску.

«І чалавек задумаўся. Склікаў ён тысячы людзей. А тысячы людзей—о-го-го! — вялікую сілу маюць: усё зробяць, што толькі пажадаюць. Прыйшлі тысячы, дзесяткі тысяч людзей у густы лес, у чыстае поле, на дзікае каменне — з сякерамі, піламі, лапатамі, ломамі ды ўзяліся за вялікую працу. Зазвінелі, загрымелі і зашумелі навокал. Аж водгаласкі пайшлі. Сякера сячэ, піла пілуе, лапата капае, лом над калёсы падлязае. Праца кіпіць аж зямля дрыжыць. Гэта настолькі цудоўна, што здаецца немагчымым, але «народ усё можа зрабіць!» — запэўнівае мяне незнаёмы чалавек».

Тое, што расказана ў гэтай былі аб працы, безумоўна можна і трэба канкрэтызіраваць, але гэта патрабуе ўжо асобнага твора.

*) Л. Н. Талстой. Пісьмо да Н.А. Някрасава.

Г. БЯРОЗКІН

# Вобраз і каментарый*)

Адной з самых вялікіх вартасцей нашаи драматургіі з'яўляецца яе тэматычная шматзначнасць. Драматург шчыра імкнецца адлюстраваць у сваіх творах падзеі вялікай важнасці, ён звяртаецца да вялікіх перажыванняў сваёй эпохі, чэрпаючы з іх сюжэты і матывы для сваіх п'ес. Цяжкасць заключаецца ў тым, каб знайсці адэкватнае тэме пластычнае яе выражэнне. Тут і пачынаюцца нашы супярэчанні супроць многіх мастакоў — аўтараў п'ес. Справа ў тым, што ў многіх п'есах, напісаных нашымі драматургамі, тэма развіваецца выключна лагічна. У іх мастак, які валодае сакрэтам канкрэтна-пачуццёвага, пластычнага выражэння тэмы, не паспявае за аўтарам — палітыкам і маралізатарам. Рэальны паэтычны вобраз, закліканы аднавіць жыццё ў яго непасрэднай відавочнасці, саступае сваё месца публіцыстычнаму каментарыю, які толькі тлумачыць, інтэрпрэтыруе жыццё, а не раскрывае яго.

У гэтым артыкуле мы-б хацелі на прыкладзе адной п'есы ўказаць на некаторыя прыватныя формы, якія часта прымае супярэчнасць паміж сэнсавай шматзначнасцю нашай драматургіі і яе ўласнавобразнай прыродай.

П'еса гэта—«Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага (другі варыянт. — «Полымя рэвалюцыі» № 10. 1939 год).

Мы прымушаны агаварыцца, што па сваіх ідэйных і мастацкіх якасцях п'еса «Бацькаўшчына» зусім не належыць да тых твораў мастацтва, якія безагаворачна ацэньваюцца як няўдалыя ці заганныя па сутнасці. Наадварот, п'еса Кузьмы Чорнага ўносіць вельмі шмат каштоўнага ў фарміраванне станоўчага вопыту нашай драматургіі.

У п'есе «Бацькаўшчына» зроблена адна з рашучых спроб стварыць тыповы характар, больш моцны і інтэнсіўны, чым сярэдні звычайны характар у бытавой штодзённасці. Патомак сілезскіх ткачоў, батрак Леапольд Гушка трапляе ў Расію. Тут ён намерваецца ажыццявіць сваю заветную мару: набыць уласнасць, зямлю, разбагацець і пачаць жыць па-чалавечаску. Гушкам цалкам авалодвае страсць да набыцця зямлі. Ён увесь захоплен гэтым імкненнем. Нават цяжка дапусціць, каб у рэальна-існаваўшым прататыпу Леапольда Гушкі (калі ўмоўна дапусціць яго існаванне) адна якая-небудзь псіхалагічная рыса выступала-б у такой меры пераўвялічана, гіпербалізіравана. Ці памяншае гэта значэнне створанага драматургам вобраза? Думаецца, што не памяншае. Кузьма Чорны праявіў дастаткова разумення таго, што стварэнне сапраўды мастацкага тыповага характару мае на ўвазе яго ўзняцце над бытам пры адной толькі ўмове, калі гэтае ўзняцце прадстаўляе магчымасць больш поўна выявіць асноўныя заканамернасці жыцця. З гэтага пункту погляду Леапольд Гушка сапраўды тыповы характар. Але... але ўсё сказанае намі прымяніма хутчэй да Гушкі задуманага, да Гушкі, выступаючага, як нейкая вобразная і псіхалагічная прадпасылка ў першых сцэнах п'есы «Бацькаўшчына», а не да Гушкі рэалізаванага, які развіваецца на працягу ўсіх чатырох актаў п'есы, у цэлым. Прадпасылкі, з якіх выходзіць драматург, жыццёва і мастацка правільныя, значныя; пластычнае-ж развіццё гэтых прадпасылак мае вельмі істотныя недахопы.

П'еса «Бацькаўшчына» пачынаецца выключна моцнай сцэнай: Леапольд Гушка распрадае сваё «дабро», свае рэчы хатняга ўжытку, свае апошнія боты. **«Адась Гушка** (збянтэжана): Бацька, што з табою, дзе твая шапка, чаму ты босы?.. **Леапольд Гушка:** Зямлю купляю...» Уся гэта сцэна поўна глыбокага хвалюючага сэнсу. Для таго, каб чалавеку купіць жалкі кавалак зямлі, яму трэба загадзя зняць з сябе апошнюю сарочку. Зусім голы чалавек, бедны, без роду, без бацькаўшчыны, ідзе купляць сабе зямлю, ідзе здабываць сабе шчасце!

Гэта сцэна ўтварае выключна моцнае ўражанне таму, што яна паэтычна праўдзівая. «З пункту погляду паэтычнай ацэнкі самыя сур'ёзныя справы тыя, якія праліваюць найбольш святла на характар асобы» **(Лессінг,** «Гамбургская драматургія»). Эпізод распрадажы Леапольдам Гушкам свайго «дабра» пралівае найбольш святла не толькі на характар тых узаемаадносін, у якія ўступала працоўнае сялянства з пануючым укладам прыватнаўласніцкага грамадства.

Такім чынам, Гушка купляе зямлю. Ён пакуль яшчэ знаходзіцца пад уладай ілюзіі. Толькі ў паслядоўным развіцці дзеі, з сустрэч з бальшавікамі, з сутыкненняў з ворагамі народа Гушка зразумее фактычную неажыццяўлёнасць сваіх замыслаў і разлікаў.

Якімі шляхамі пойдзе гэтае перараджэнне Леапольда Гушкі? Чалавек-жа як-ніяк адмаўляецца не ад выпадковых капрызаў, а ад цэлага раду ўкараніўшыхся рысаў характару. Натуральна, такога роду перараджэнне павінна быць строга і ўсебакова матывіравана. Перад драматургам тут стаіць задача ўскрыць складаны працэс, паглыбіцца ва ўсе яго ўнутраныя сувязі, залежнасці, пераходы. Ці выканаў гэту задачу Кузьма Чорны? Нам здаецца, што не зусім.

Самая вялікая памылка Чорнага, дапушчаная ім у «Бацькаўшчыне», заключаецца ў тым, што ён правёў п'есу па рэчышчу вонкавых падзей, амаль зусім адмовіўшыся ад унутранай сілы самаразвіцця. Замест таго, каб паказаць барацьбу супярэчлівых уласцівасцей характару Гушкі, у даным выпадку барацьбу дробнаўласніцкага інстынкту з парасткамі новай камуністычнай свядомасці, Кузьма Чорны пайшоў па іншаму, больш лёгкаму і менш удзячнаму шляху: ён раз'еднаў адзінства гэтых змагаючыхся ўласцівасцей і ў паасобку ўвасобіў іх самастойныя вобразы. Так, з аднаго Гушкавага рабра створан Павал Няміра, а з другога — Цывін. Затое сам Гушка аказаўся без рабро?, без плоці.

У першым акце, калі Гушка распрадае свае рэчы, чытач бачыць героя дзеючым, героя ў сцэнічным руху. У наступных актах п'есы герой толькі гаворыць палітычныя фармулёўкі і лозунгі, накшталт «Цара скідайце!», «Усё, што чалавека душыць — скіньце вы!», «Лепш у магіле гніць, чым жыць у такой бацькаўшчыне», «За якую ваяваць бацькаўшчыну?» і г. д. і г. д. Паколькі ўсе гэтыя палітычна акрэсленыя фразы не з'яўляюцца рэзультатам **бачымай** рэальнай дзейнасці свядомасці Леапольда Гушкі, дык па адпаму ўжо гэтаму яны не здольны выклікаць мыслей чытача у адказ. Яны гучаць, як цытата. Характэрна, што апаненты і ворагі Гушкі выкарыстоўваюць цытатнасць усіх гэтых фраз, як сродак супроцьдзейнічання. У адказ на адну з чарговых цытат Гушкі Павал Няміра заўважае:

«А-а-а. Цывінавы словы!» З ім цяжка не згадзіцца, на самай справе, гэта — словы Цывіна, запазычаны цывінаўскі розум, запазычаны, не засвоены сэрцам вопыт. За імі не адчуваеш ніякага напружання мыслі і таму яны прымушаюць адносіцца да іх зусім фармальна. Белагвардзейскі палкоўнік называе Гушку «прапаведнікам». Мы ненавідзім палкоўніка, але мы не можам не згадзіцца з яго ацэнкай. Гушка сапраўды прапаведнік, які вяшчае ісціну, а не жывы, дзейнічаючы герой п'есы. І вывад аб яго перавыхаванні мы зможам зрабіць не столькі з рэальна назіраючых узаемадзеянняў супярэчлівых уласцівасцей яго характару, колькі з супроцьстаўлення цэлага раду агульных фраз, формул, рэплік, сказаных героем. Для п'есы гэта, разумеецца, недастаткова.

Перавыхаваўшамуся Леапольду Гушку супроцьстаіць Павал Няміра, які канчаткова нагрузнуў у багне ўласніцкіх звычак, страсцей, забабонаў. Літаратурна Няміра выпісан драматургам вельмі моцна. У прыватнасці, тое месца, дзе Павал расказвае аб сваім уцёку з фронта—робіць вельмі моцнае ўражанне. Чытач адчувае ўсе пахі зямлі, якія ўскружылі галаву Няміру. Тут ёсць сапраўдны пафас усёпаглынаючай любві да зямлі, да прыроды, да жыцця. Шкада, што не Гушка гаворыць гэты маналог. І наогул, няўдалая, на нашу думку, сама мысль аб'ектывізіраваць адзін з бакоў характару Леапольда Гушкі ў самастойным кантрастыруючым вобразе. Калі-б па гэтаму металу вобразных кантрастаў быў напісан «Егор Булычоў», дык у п'есе, напэўна, побач з Булычовым дзейнічалі-б яшчэ два асноўныя персанажы: аднаму з іх аўтар-бы аддаў кандовую купецкую сутнасць Булычова, а другому — яго пакутлівы неспакой, яго мяцежны дух. Не цяжка сабе ўявіць, што-б стала з гэтай класічнай п'есай савецкага рэпертуара, калі-б Горкі ішоў па такому шляху.

Часта гавораць аб горкаўскім уплыве ў творчасці Кузьмы Чорнага, і таму мы сабе дазволілі гэту аналогію. Мяркуючы па п'есе «Бацькаўшчына», драматург Чорны шмат чаму навучыўся ў Горкага, але не навучыўся яшчэ ўменню даверыцца свайму герою, уменню развіваць чалавечы вобраз з яго-ж уласных супярэчнасцей, а не падштурхоўваць яго, не прыспешваць пабочнымі ўмяшацельствамі, публіцыстычнымі каментарыямі.

Іменна такімі публіцыстычнымі каментарыямі выглядаюць у п'есе «Бацькаўшчына» фігуры Евеля Цывіна і Адася Гушкі. З пункту погляду агульнага замыслу п'есы ў цэлым гэтыя вобразы бальшавікоў-рэвалюцыянераў маюць рашаючае значэнне. Але толькі з пункту погляду агульнай праблемы, якую вырашае драматург. Задача заключаецца ў тым, каб зрабіць гэтыя вобразы арганічнымі, неабходнымі, абавязковымі ў самой п'есе з пункту погляду падзей, якія адбываюцца ў п'есе.

У «Бацькаўшчыне» Кузьмы Чорнага бальшавік Цывін — умова задачы, вырашаемай драматургам, а не дзеючая асоба. Ён не жыве ўласным, належным яму жыццём. І словы ён гаворыць не тыя, якія яму, жывому Евелю Цывіну, трэба было ў гэтую мінуту, у гэтай сітуацыі гаварыць, а тыя, якія патрэбны аўтару для больш паспяховага вырашэння задачы.

«Аргументыруючых прамоў» — г. зн. прамоў, аднятненых, зусім незалежных ад таго рэальнага становішча, у якім знаходзяцца героі, у «Бацькаўшчыне» вельмі шмат. Простыя сяляне ў доўгіх прамовах ацэньваюць палітычнае становішча краіны, якое стварылася пасля Лютаўскай рэвалюцыі, і намячаюць шляхі новай, сацыялістычнай рэвалюцыі. **«Кастусь Суровец.** То быў цар, а гэта нейкі Керанскі чорт ведае адкуль узяўся... Добра той Цывін кажа: хоць яшчэ адну рэвалюцыю рабі...» Гэта, вядома, не ўласныя словы жывога чалавека, а толькі повад для драматурга рабіць патрэбныя яму вывады.

Міліцыянеры Часовага ўрада трапляюць у сялянскую хату. Адзін з іх гаворыць у адказ на загад старшага прадстаўніка прыняць рашучыя меры супроць незадаволеных сялян: «Што-ж я ім зраблю? Яны як возьмуцца ўсе, дык нас недзе у пыл змятусяць...» Зноў патрэбная аўтару мысль аб сіле народа перададзена першатрапіўшаму персанажу, хаця па ходу сваіх мыслей гэты персанаж павінен быў гаварыць зусім іншае. Такіх прыкладаў з п'есы «Бацькаўшчына» можна было-б прывесці вельмі шмат.

П'есе нехапае сканцэнтрыраванасці на асноўных рашаючых момантах тэмы. У адной першай сцэне II акта столькі падзей, што герою няма калі адлыхацца, перавесці дух. У часе вяселля дачкі Леапольду Гушку прыходзіць падданства, з турмы варочаецца Адась, прыбывае вестка аб вайне, адбываецца вялікая сумятня. Героі ідуць услед падзеі і не знаходзяць сабе месца. У кожным поўнацэнным творы мастацтва агульная мэта павінна быць «ажыватворана да такой ступені, што яна стала індывідуальнай мэтай, па прыватнаму рэчышчу якой рухаецца цэлае» **(Гегель,** «Эстэтыка»), і гэта мэта павінна «прыняць аблічча некаторай падзеі». Так мы сутыкаемся з праблемай сюжэта, з праблемай адбору і самаабмежавання, якія з'яўляюцца сакрэтам мастацтва.

Кузьма Чорны награмаджае залішне многа падзей вонкавага парадку, што і перашкаджае яму сканцэнтрыравацца на рашаючых момантах росту і фарміравання сваіх герояў. Ён дапускае памылку, вельмі характэрную для многіх драматургаў, якія схільны да хваробы гігантаманіі, мала клапоцяцца аб дасканалым адборы матэрыялу і яго вобразна-пластычным афармленні. Як твор, напісаны таленавітым пісьменнікам, «Бацькаўшчына» толькі падкрэслівае гэтыя недахопы. І разгляд гэтых недахопаў мае істотнае, на нашу думку, значэнне для далейшага росту нашай драматургіі.

*) Друкуецца ў парадку абмеркавання.



Помнік В. І. Леніну з карэльскага граніту, устаноўлены ў гор. Петразаводску (Карэла-Фінская ССР). Работа засл. дзеяча мастацтваў М. Г. Манізера.

Фота Я. Роскіна (ТАСС).



Польскі народны танец «Трояк» у выкананні групы танцораў ансамбля песні і пляскі Беластоцкай філармоніі пад кіраваннем Р. Р. Шырмы. Балетмейстар І. М. Хвораст (першы злева).

Фота І. Каплінскага.

## РАДАСНА ТВАРЫЦЬ НА КАРЫСЦЬ НАРОДА

Панская Польшча на працягу 20 год праводзіла жорсткую эксплаатацыю працоўных Заходняй Беларусі. Армія жандараў і сышчыкаў, ксяндзоў і памешчыкаў, асаднікаў і кулакоў пільна сачыла за тым, каб адабраць ад беларускага народа яго мову, зачыніць яму доступ да навукі і культуры. Народная творчасць выстаўлялася, як нешта «нізшае, хамскае», няварте таго, каб яго любілі і развівалі; народная песня заганялася ў падполле. Паны баяліся народнай свядомасці. Для гэтага Польшча сваім мертвячым сярэдневяковым подыхам імкнулася нішчыць усё жывое, усё здольнае да творчай працы, да барацьбы за лепшае, светлае заўтра.

Чырвоная Армія ўвосень 1939 года парвала ланцугі няволі і вызваліла беларускі народ ад панскіх путаў.

Яркае сонца сацыялізма, іскрыстыя праменні Сталінскай Канстытуцыі сваім жыватворчым цяплом і святлом адразу выклікалі да жыцця ўсе творчыя сілы ў народзе.

Дзякуючы клопатам савецкага ўрада і вялікай партыі Леніна—Сталіна вырас і наш ансамбль песні і пляскі ў Беластоку, на заходніх рубяжах вялікага Саюза ССР. Аб нашай рабоце, аб нашым росце нястомна клапоціцца мясцовая абласная партыйная арганізацыя.

Складаецца ансамбль з працаўнікоў самадзейнасці, якія раней вялі сваю працу, хаваючыся ад панскага вока. Цяпер яны—рабочыя—тэкстыльшчыца Сабеская, плытагон Шарэйка, столяр Анішчык і інш.; сялянскія дзеці—Бязмен, Трахімчык, Кузьміч; былыя палітзняволеныя—Шылдоўскі, Касцюкевіч; таленавітая моладзь,—вольна, шчасліва творыць на карысць вялікага савецкага народа.

У складзе ансамбля—беларусы, рускія, яўрэі, украінцы, палякі. І гэта—прыклад таго, як там, дзе раней панавалі звярыны нацыяналізм і сярэдневяковы дурман клерыкальнага фанатызма, расце і квітнее дружба народаў.

Арганізацыя ансамбля была скончана 7 лютага, а 23 ўжо адбылося першае публічнае выступленне. За першы месяц свайго існавання ансамбль выступаў 48 разоў. У часе выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР наш калектыў прымаў актыўны ўдзел у абслугоўванні выбарчай кампаніі, абслугоўваў у парадку шэфства баявыя часці Чырвонай Арміі, выязджаў на гастролі ў раёны вобласці.

У праграме ансамбля—масавыя песні, песні савецкіх кампазітараў і народныя песні і танцы заходніх абласцей БССР.

Ансамбль ставіць перад сабою пачэсную задачу—усе свае сілы аддаць на службу вызваленаму народу, які творыць новыя песні, новы фальклор пра шчаслівае вольнае жыццё на вызваленай зямлі.

І вось гэтыя здабыткі творчасці народа мы будзем шырока папулярызіраваць, аддаючы гэтаму ўсе свае сілы і майстэрства, сярод шырокіх мас працоўных, будзем нястомна працаваць на карысць нашай квітнеючай сацыялістычнай культуры.

**Р. ШЫРМА.**

**Мастацкі кіраўнік ансамбля песні і пляскі Беластоцкай філармоніі.**

## УЗНЯЦЬ АКТЫЎНАСЦЬ МУЗЫКАНТАЎ-ВЫКАНАЎЦАЎ

У дні, калі савецкая грамадскасць адзначала 100-годдзе з дня нараджэння найвялікшага рускага кампазітара П. І. Чайкоўскага, у Гомелі сіламі музычнага вучылішча, музычнай школы і самадзейнасці было праведзена некалькі канцэртаў.

Вядома, цяжка сіламі музычнай школы арганізаваць канцэрт з твораў Чайкоўскага. Апрача «Дзіцячага альбома» і некалькіх, на жаль, лічучыхся «лёгкімі», невялікіх п'ес для раяля, у Чайкоўскага няма твораў, даступных для вучняў музычнай школы. Прыходзілася рабіць перакладанні простых фартэп'янных п'ес для іншых інструментаў, перакладанні, часта вельмі няўдалыя, скажаючыя мысль аўтара. Усё гэта можа, вядома, растлумачыць, але зусім не апраўдаць тую нізкую якасць канцэртаў, якую мы павінны канстатыраваць.

Цыкл канцэртаў завяршыў агульнагарадскі канцэрт. На гэтым канцэрце выступленні прадстаўнікоў самадзейнасці чаргаваліся з выступленнямі студэнтаў музычнага вучылішча. Калі апошнія і заслугоўваюць нядрэннай ацэнкі ў плане вучнёўскага выканання ў закрытым канцэрце навучальнай установы, дык дастатковых магчымасцей паказваць творчасць Чайкоўскага ў маштабе гарадскога канцэрта ў іх не было. Канцэрт прайшоў на вельмі нізкім мастацкім узроўні.

Усё гэта рэзультат таго, што ў Гомелі — горадзе з 150-тысячным насельніцтвам, горадзе, у якім больш 20-ці год існуе музычная школа, што мае вялікі кантынгент вучняў, дзе 8 год існуе музычнае вучылішча,—не наладжана канцэртная дзейнасць, папулярызацыя лепшых узораў музычнага мастацтва.

Ні рэспубліканская філармонія, ні іншыя музычныя арганізацыі не клапоцяцца аб наладжванні канцэртаў, якія-б з'яўляліся ў поўнай ступені падзеяй у музычным жыцці такога вялікага абласнога горада, як Гомель. Наяўныя выканаўчыя сілы горада таксама не аб'яднаны. А магчымасці для развіцця ў нас канцэртнай дзейнасці ёсць. Патрэбна толькі дапамога ў гэтым з боку рэспубліканскіх музычных арганізацый.

**Г. КАЧЭВІЦКІ.**

Гомель.

## ТЭАТРАЛЬНЫЯ НАВІНЫ

⊙ 17 мая ў Віцебску спектаклем «Ольга Іванаўна» Ялунера пачаў свае гастролі Смаленскі абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола. «Ольга Іванаўна»—п'еса аб савецкай інтэлігенцыі, аб савецкай моладзі. Спектакль прайшоў з вялікім поспехам. За час гастролей у Віцебску тэатр пакажа Лопе-дэ-Вега «Дурная для ўсіх, разумная для сябе», Остроўскага, Салаўёва «Жаніцьба Бялугіна», Паустоўскага «Простыя сэрцы», Германа «Сын народа» і інш.

⊙ У першых чыслах чэрвеня ў Мінску пачынае свае гастролі Рускі драматычны тэатр БССР. У рэпертуары тэатра: «Сабака на сене» Лопе-дэ-Вега, «Загавар» Вірта, «Каварства і любоў» Шылера, «Таленты і паклоннікі» Остроўскага і інш.

⊙ Дзяржаўны тэатр музкамедыі БССР заканчвае работу над першай беларускай аперэтай «Зарэчны барок» Палонскага і Іванова. Прэм'еру тэатр пакажа ў канцы мая. Тэатр таксама заканчвае работу над прэм'ерай «Сільва», музыка Кальмана.

⊙ Дзяржаўны тэатр юнага гледача БССР, які гастраліруе зараз у Магілеве, працуе над «Казкай» Светлова ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра тав. Сухарэва. Пасля гастролей тэатр выедзе для абслугоўвання піонерскіх лагераў.

⊙ Віцебскі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр пачаў 22 мая свае гастролі ў Мінску спектаклем «Над Бярозай-ракой» ордананосца П. Глебкі. Тэатр пакажа таксама мінскаму гледачу п'есы «Павел Грэкаў» Ленча і Войцехава, «Не ўсё кату масленіца» Остроўскага, «Крэмлёўскія куранты» Пагодзіна. Тэатр будзе працаваць у Мінску да 1-га ліпеня.

⊙ Смаленскі абласны драматычны тэатр 5 ліпеня пачне свае гастролі ў Беластоку. Мастацкі кіраўнік тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў І. А. Растоўцаў закончыў пастаноўку прэм'еры «Іваноў» Чэхава. Апрача таго, у рэпертуары тэатра «Гора ад розуму» Грыбаедава, «Мяцель» Леонава, «Мачыха» Бальзака, «Сады цвітуць» Маса і Кулічэнка і інш.

⊙ У жніўні ў памяшканні тэатра оперы і балета БССР пачнуцца гастролі Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра імя Горкага. Тэатр дасць у Мінску 30 спектакляў, пакажа гледачу пастаноўкі п'ес: Пагодзіна «Крэмлёўскія куранты», Эміля Заля «Наследнікі Рабурдэна», Капкова «Цар Патап», Спешнева «Падарунак Нептуна», Скрыба «Шклянка вады», Леонава «Бегства Сандукова», Прыстлі «Карнеліус», Горкага «Мяшчане» і «Дачнікі». Спектаклі ідуць у пастаноўцы народных артыстаў РСФСР орданосцаў Б. А. Бабачкіна і П. П. Гайдэбурава.

## Ансамбль песні і пляскі пад кіраваннем Р. Шырмы ў Мінску

Некалькі дзён у Мінску гасціць ансамбль песні і пляскі Беластоцкай дзяржаўнай філармоніі пад кіраваннем Р. Р. Шырмы.

17 мая ансамбль даў канцэрт у Доме пісьменнікаў. Пісьменнікі надзвычай цёпла сустрэлі выступленне ансамбля і далі высокую ацэнку выкананню ансамблем народных песень і танцаў.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР у спецыяльным загадзе адзначыла плённую творчую і грамадскую работу ансамбля. У загадзе аб'яўлена падзяка мастацкаму кіраўніку ансамбля тав. Шырму, балетмейстару тав. Хворасту і раду актывістаў ансамбля.

Начальніку беластоцкага абласнога аддзела мастацтваў і дырэкцыі беластоцкай філармоніі прапанавана звярнуць асаблівую ўвагу на работу ансамбля і стварыць яму ўсе ўмовы для далейшага творчага развіцця.

А. УШАКОЎ

# Аб некаторых „дробязях" паэзіі

Беларуская савецкая паэзія за апошнія годы значна ўзрасла. Паявілася многа твораў вялікай мастацкай сілы і ідэйнай вартасці.

Роля паэзіі ўзрасла. Паэзія стала дзейснай. Гэта відавочна паказалі дні вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

Усё гэта гаворыць за тое, што беларуская паэзія стаіць на правільным шляху, што перад ёй неабмежаваныя магчымасці творчага росту.

Тым больш мы павінны быць патрабавальны да паэзіі і рашучай змагацца з тымі хібамі, якія зніжаюць яе якасць, якія да некаторай ступені затрымліваюць развіццё, перашкаджаюць яе паспяховаму росту. На першы погляд, гэтыя недахопы здаюцца дробязнымі, але маюць істотнае значэнне ва ўзняцці якасці паэзіі.

За апошнія годы ўсё часцей і часцей гавораць аб скарыстанні паэзіяй багатай народнай творчасці. Гэта зусім своечасова, калі не сказаць занадта позна. Аб гэтым трэба было гаварыць даўно і сур'ёзней, чым дагэтуль у нас рабілася.

Беларускі народ мае сваю багатую шматвяковую творчасць, цікавейшыя прымаўкі, легенды, казкі, песні, у якіх выражаны думы народа, сабраны багацейшыя скарбніцы мовы. І вось гэтае багацце многімі паэтамі абыходзіцца, быццам яго і не існуе. Паэты абкрадаюць самі сябе. Праўда, нашы народныя паэты Купала і Колас, якія ўсё жыццё пражылі неразрыўна са сваім народам і выражалі яго настрой і думы, умела і багата скарыстоўвалі і скарыстоўваюць народную творчасць. Але як быць маладым, творча не ўзмацнеўшым, у якіх яшчэ нехапае дастатковага крытычнага падходу, якім многае яшчэ трэба браць гатовым?

Зборнікі народнай творчасці, якія за апошнія годы выданы Акадэміяй навук, амаль нікольві не дапамагаюць паэту ў яго рабоце: Дарэвалюцыйная народная творчасць у іх прадстаўлена вельмі мала, а савецкі фальклор падабран беспринцыпна, безгустоўна. Побач з цудоўнымі песнямі вялікай мастацкай сілы: «Лён», «Ці багаты, зяцюхна», «Песня калгасніцы», вядомымі на ўвесь Савецкі Саюз, як лепшыя народныя творы, ёсць і зусім слабыя, няправільна аднесеныя да народных. Атрымліваюцца такія анекдатычныя казусы. Пачынаючы паэт напісаў верш, паслаў у рэдакцыю газеты. З-за мастацкай слабасці яго не надрукавалі. Гэты верш прадстаўнікі Акадэміі запісалі са слоў самога аўтара, і вось ён (верш) становіцца, з лёгкай рукі Акадэміі, ужо народнай творчасцю.

Годзе ім на зямлі нашай роднай
Пот і кроў нашу піць і смактаць,
І на шыі рабоча-сялянскай
Дзень і ноччу да позна гуляць.

Відавочны першыя практыкаванні пачынаючага паэта. Такую творчасць чытаеш і дзіву даешся: па якому праву яна трапіла ў народную? Такая няправільная арыентацыя прыносіць толькі шкоду, дыскрэдытуе народную творчасць, а маладым паэтам прывівае дрэнны густ. Літаратурны маладняк павінен выхоўвацца на добрых узорах творчасці.

Кожная літаратура мае свае шаблоны. Чым багацей мова і сама літаратура — тым яны менш заўважны. У беларускай паэзіі таксама ўстанавіліся пэўныя шаблоны, якія сведчаць аб тым, што аўтары не хочуць шукаць у некаторых выпадках свайго асабістага разумення тэмы, вобраза ці рыфмы. Устанавіліся шаблоны рыфмаў. Не знойдзеш ні аднаго паэта, у якога-б не сустракалася рыфма «сонца — бясконца», «усмешка — сцежка» і г. д.

Таксама ўстанавіўся, калі можна так сказаць, «шаблон агульных месц». Напрыклад, у вершы Агняцвет «Дэпутат Марыя» чытаем пра жанчыну Заходняй Беларусі:

Жывеш ты цяпер пад высокім штан-
дарам,
На небе тваім не бываць ужо хмарам.

У Бялевіча:

Хай надхмар'е не вісне над вёскай,
Хай не блукае здань пад акном.

«Здань, хмары, ноч» тут выражаюць няволю.

Шаблон агульных характарыстык хутка павінен знікнуць з паэзіі, бо паэзія заклікана абуджаць пэўныя эмоцыі, ствараць аднаведны настрой, а агульныя недакладныя азначэнні і вобразы не могуць выклікаць пачуцця.

З кожным годам у паэзіі з'яўляюцца новыя імёны. Але паэт яшчэ не паэт, пакуль у яго няма ўласнага голасу.

Некаторыя нашы маладыя паэты, якія друкуюцца ўжо некалькі год,—і даволі часта выдалі па зборніку,—яшчэ не маюць яркіх індывідуальных манер. Напрыклад, у Агняцвет і Астрэйкі толькі за апошні час пачалі вызначацца індывідуальныя рысы творчасці. У творчасці Няхая, Гейне, Сямашкі, Бялевіча, Бачылы і іншых маладых паэтаў не адчуваецца ніякай школы.

У нас не ўстанавілася добрай традыцыі, каб кожны пачынаючы ці малады паэт пачынаў сваю творчасць з адной якой-небудзь школы і не кідаўся ад аднаго паэта да другога. Гэта—дэфект выхавання паэтычнага маладняка.

Малады паэт траціць некалькі год, пакуль самастойна не ўсвядоміць шляхі развіцця сваёй творчасці. Напрыклад, ці сказала крытыка хоць адно слова пра творчасць тт. Астрэйкі, Сямашкі, Няхая, пакуль яны не выдалі па першым зборніку вершаў? Ды і цяпер крытыка не асабліва ўважлівая.

У нас не прывілося, каб кожны малады паэт пачынаў з пэўнай паэтычнай традыцыі. Гэта не заахвочваецца. На наш погляд, для кожнага абавязкова такая школа. Хай малады нават пачне з перайманця, але ў паэта ўжо спачатку выпрацоўваецца адна пэўная манера творчасці. Перайманне на першых кроках творчасці не трэба ставіць у віну. Нават такія паэты, як Пушкін, Лермантаў, Някрасаў пачыналі сваю творчасць з перайманняў, пакуль узмацнелі і правільна змаглі ўбачыць свае творчыя асаблівасці. Багрыцкі не мысліцца без англійскай паэзіі, Кірсанаў — без Маякоўскага, хоць у кожнага свой яркі творчы твар.

Прычым, трэба пачынаць з добрай школы, бо толькі такая школа здольна з самага пачатку прывіць здаровы літаратурны густ, адчуванне слова, нянавісць да шаблонаў.

Напрыклад, у Панчанкі ў асобных вершах адчуваецца ўплыў Багрыцкага, рад вобразаў не самастойны. Але гэта з цягам часу пройдзе, калі паэт на аснове ведаў жыцця і пройдзенай школы выпрацуе сваю манеру, уласцівую толькі яму.

На паэтычных сх..х часам узнікаюць спрэчкі аб тым, якой павінна быць рыфма—звонкай ці сугучнай. Некаторыя прыгэтым гавораць, што рыфма — справа густу. Але-ж кожны час выпрацоўвае свой густ, свае эстэтычныя меркі.

Рыфма ў рускай літаратуры эвалюцыяніэіравала на працягу ўсяго XIX стагоддзя. Нават ад Пушкіна да Некрасава адбыліся вялікія змены ў рыфме, не кажучы ўжо пра наш час, пра Маякоўскага. Рыфма ў беларускай паэзіі нават за апошнія 15 год прарабіла заўважныя змены. Паэзія ад сугучнасцей і няпоўных рыфмаў пераходзіць да поўнай, звонкай.

Творчасць Купалы і Коласа ў аснове сваёй заставалася ў рамках поўнай рыфмы. Іх творчасць і іх пераклады рускіх класікаў на беларускую мову ўсё больш пераконваюць нас у большай жыццёвасці поўнай рыфмы перад сугучнай.

Звычайна прыхільнікі сугучнай рыфмы ў доказ сваёй праваты апіраюцца на аўтарытэт Маякоўскага. Але якраз Маякоўскі, адмовіўшыся ад класічнай рыфмы, супроцьставіў сваю—хоць і няпоўную, але вельмі гучную рыфму. Такія рыфмы, як «душа—шаг»—у яго рэдкая з'ява. Сугучнасць у яго ідзе на шмат літар, часта рыфма складаецца з двух слоў: «галстук—услыхал стук», «спокойный как—покойника» і г. д. Ды і поўную рыфму Маякоўскі ўжывае часцей, чым гэта многім здаецца.

Некаторыя-ж паэты, узяўшы горшае ад сугучнай рыфмы і таксама карыстаючыся поўнай, уносяць у паэзію блытаніну, зрабіўшы вывад аб лёгкасці стварэння паэзіі.

Канешне, у наш час магчымасці рыфмы пашырыліся: засталося лепшае ад класічнай спадчыны і створаны новыя рыфмы—сугучныя, якасныя, і кожная з іх мае роўнае права на існаванне. Такія шырокія магчымасці аблягчаюць творчасць паэта. Але некаторыя з гэтага робяць няправільны вывад. Атрымліваюцца парадоксы. Напрыклад, ужываецца рыфма «нясу—сум». Тут-жа «сум» рыфмуецца з словам «дум». Але ўжо «думнясу»—ніякай рыфмы няма. Тут відавочна негрунтоўнасць такіх рыфм. Вельмі прыкра, калі такія з'явы сустракаюцца ў адным вершы ці зборніку. Напрыклад, у Панчанкі знаходзім: слова «ураджай» рыфмуецца з «прымай», а потым рыфмуецца з «дрыжаць»; «сад—лад» і потым «сад—раса». Такія прыклады можна знайсці і ў другіх паэтаў.

Сугучныя рыфмы трэба ўжываць нароўні з поўнымі, але такія, каб яны не зніжалі якасці паэзіі. Рыфма эвалюцыяніэіруецца ў добры бок і нельга яе затрымліваць. Магчымасці паэзіі трэба пашыраць, бо гэта дапамагае паэту найбольш дакладна і найбольш поўна выказаць думку. Тут толькі на дапамогу павінен прысці строгі суддзя—густ паэта. Не сакрэт, што часам малады паэт у пагоні за цікавай рыфмай губляе дакладнасць думкі, вобраза. У сувязі з гэтым паўстае пытанне пра адносіны да дзеяслоўнай рыфмы. Многія пазбягаюць дзеяслоўнай рыфмы, лічачы яе рыфмай ніжэйшага гатунку, бо дзеясловам лягчэй пісаць і г. д. Гэта няправільна. Спецыяльна пазбягаць дзеяслоўных рыфмаў нельга, таксама як і пісаць толькі аднымі імі.

Магчымасці паэзіі трэба пашыраць, гэта забяспечыць яе шпарчэйшы рост і вышэйшую якасць.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25 394 Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Г—1450